КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нанпарэлі пасярод тэксту	1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. даражэй.

Зьмен тарыфу бярэцца 10 проц. надбаўкі.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх памт.-тэл. конторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 94 (2583) Пятніца, 26-га красавіка 1929 г.

XVI УСЕСАЮЗНАЯ ПАРТЫЙНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ.

ПЯЦІГАДОВЫ ПЛЯН САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Спрэчкі па дакладах.

(Пасяджэньне 24-га красавіка).

Спрэчкі распачынаюцца па ўсіх 3-х дакладах аб пяцігадовым пляне.

Разьвіцьцё сел.-гасп. раёнаў увязаць з разьвіцьцём у іх прамысловасьці.

Тав. Грэдзінскі (ЦЧВ), прызнаючы, што пяцігодка правільна адбівае лінію партыі на індустрыялізацыю, гаворыць, што неабходна больш шчыльна ўвязаць разьвіцьцё асноўных сельска-гаспадарчых раёнаў з разьвіцьцём у іх прамысловасьці. У такіх раёнах неабходна ўзмацніць энэргетычную базу. Па Цэнтральнай Чарназёмнай вобласьці неабходна ў пяцігодку ўнесьці папраўку ў сэнсе ўзмацненьня індустрыялізацыі сельска-гаспадарчай вобласьці. Вобласьць населена выключна сялянскім насельніцтвам, у ёй амаль зусім адсутнічае пралетарыят. Цэнтральныя органы павінны дапамагчы ЦЧВ пашырыць мэталёвы завод і разьвіць яго ў буйны мэталёвы камбінат, пабудаваўшы побач з ім трактарны завод, які прадугледжваецца пабудаваць на Урале.

Тав. Чубар (Украіна). Хоць некаторыя папракаюць партыю ў надмернасьці тэмпаў росту намечаных у пяцігадовым пляне, але працаўнікі месц, якія выступілі тут, відавочна, нават гэты шпаркі тэмп лічаць недастатковым. Усе яны патрабуюць пашырэньня будаўніцтва на мясцох. Але нельга забываць, што гэта патрабуе сродкаў і тэхнічных магчымасьцяй. Лепш менш вымагаць ад цэнтральных органаў і больш вымагаць ад саміх сябе ў справе практычнага выкананьня плянаў пяцігодкі. Нашы плянавыя органы намецілі буйнейшыя праграмы. Выканаць іх можна, калі ўзьняць на гэты час усю партыю і працоўныя масы. Асноўная ўмова выкананьня плянаў—гэта суровае, цьвёрдае кіраўніцтва партыі.

Што-ж датычыць украінскіх гаспадарчых праблем, дык трэба сказаць, што пяцігодка на Украіну ўскладае буйнейшыя задачы. Каб Данбас выканаў заданьне павялічэньня здабычы вугалю ў два разы, трэба ў дастатковай меры яго электрыфікаваць. Чакаючы Днепрастрою, неабходна ўзмацніць тэмп будаўнічых работ на Зуеўскай станцыі і інш. Таксама неабходна паскорыць тэмп пабудовы хімічных заводаў. Належыць зьвярнуць асаблівую ўвагу на стэпавую частку Украіны, якая ахапляе да 10 міліёнаў гэктараў.

Пытаньні транспарту ў 5 гадовым пляне

Тав. Пахомаў (Ніжні Ноўгарад) спыняецца на пытаньнях транспарту. Дзяржплян зьяўляецца прыхільнікам ажыцьцяўленьня Сібірскай звыш-магістралі і Волга-Дону. Ажыцьцяўленьне гэтых праэктаў не сустракае падтрыманьня як раз з боку тых, хто ведае пытаньнямі транспарту. Але іх гаспадарчае значэньне бясспрэчна. Ужо зараз чыгуначны транспарт зьяўляецца самым вузкім месцам, прыпыняючым гаспадарча разьвіцьцё Сібіру. Даволі выяўлена і значэньне Волга-Дону. Партыйная канфэрэнцыя павінна выказаць сваю думку па гэтым важнейшым пытаньні.

Тав. Камароў (Ленінград) гаворыць аб тым, што значэньне пяцігадовага пляну ўяўлена ня толькі партыяй, але і рабочымі масамі. Партыя дасьць рашучы адпор усім тым, хто хоча пасеяць ваганьні ў нашых шэрагах. Далей, т. Камароў зазначае на неабходнасьць увязкі пяцігадовага пляну ў абласным і раённым разьмеры, устанаўленьня дакладных заданьняў для кожнага заводу і кожнай фабрыкі.

Тав. Пятроўскі (Украіна) зазначае на неабходнасьць парайённай прапрацоўкі пытаньняў аб прамысловым будаўніцтве. Трактарны завод будуецца на Урале, а завод прычэпных прылад—на Украіне. Адзін з лепшых цягнікова-будаўнічых заводаў у Харкаве хочуць дапасаваць да трактара-будаўніцтва, прычым да канца пяцігодкі ён павінен выпускаць штогод 5 тысяч трактараў. Пры такім падыходзе мы не атрымаем неабходнага вытворчага эфэкту. Недастатковая ўвага ў пяцігодцы зьвяртаецца разьвіцьцю воднага транспарту. Да канца пяцігодкі ён ледзь перавысіць даваенны ўзровень. Мала ўвагі мы зьвяртаем на тое, каб наблізіць электраэнэргію да вёскі і ўвесьці яе для ўласнай патрэбы рабочага.

Спыняючыся на правым ухіле, тав. Пятроўскі зазначае, што барацьба з ім будзе доўгая. У нашых умовах, пры пераважаньні ў асобных раёнах сельскай гаспадаркі і лёгкай прамысловасьці, няўхільны тэндэнцыі да зьмяншэньня асыгнаваньняў на цяжкую прамысловасьць, да скажэньня генэральнай лініі партыі. Але партыя здолее перамагчы ваганьні ў гэтым пытаньні.

Прафсаюзы і кадры.

Тав. Шацкін (Саратаў) спыняецца на палітычных прадпасылках ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну і зазначае на неабходнасьць карэннай перабудовы мэтадаў работы прафсаюзаў, у працы якіх намячаюцца два нездаровыя ўхілы: адзін—трэд-юніёнісцкі, другі—бюракратызацыя. Тав. Шацкін спыняецца далей падрабязна на характарыстыцы правага ўхілу і прымірэнцтва і барацьбе з імі.

Тав. Лобаў (Донвугаль) гаворыць аб тым, што вугальная пяцігодка прапрацоўвалася адначасна ў Дзяржпляне і на месцы, у Данбасе. Абедзьве пяцігодкі амаль дакладна супадаюць. Гэта гаворыць аб жыцьцёвасьці намечанай праграмы. Але вельмі востра стаіць у Данбасе пытаньне аб кадрах. Нездавальняючыя кватэрныя і бытавыя ўмовы не даюць магчымасьці змагацца з бягучасьцю рабочага складу. На гэта патрэбна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу.

Тав. Лугавы (ЦК хімікаў) зазначае на тое, што для хімічнай прамысловасьці пытаньне аб кадрах стаіць асабліва востра, бо мы ня маем неабходнай кваліфікаванай рабочай сілы, інжынэраў і тэхнікаў. Да канца пяцігодкі для хімічнай прамысловасьці будзе патрэбна да 12 тысяч кваліфікаваных інжынэраў, а ёсьць іх толькі 3 тысячы. Нашы ВТУЗ'ы дадуць яшчэ 5 тысяч, але гэтага яшчэ вельмі мала. Мы адчуваем недахоп і ў арганізатарах новых магутных хімічных прадпрыёмстваў, якія мы ўтвараем. Далей т. Лугавы зазначае на тое, што прафсаюзы павінны зьвярнуць усю ўвагу на вырашэньне гаспадарчых задач, інакшай мы рызыкуем зрывам усяго пяцігадовага пляну.

Пяцігадовы плян і нацрэспублікі.

Тав. Павалоцкі (Казакстан) зазначае на тое, што пяцігадовы плян усё-ж зьвяртае недастатковую ўвагу разьвіцьцю прамысловасьці ў гаспадарча-адсталых нацыянальных рэспубліках. Гэта ўскладняе пераход ад экстэнсыўных да інтэнсыўных форм вядзеньня сельскай гаспадаркі і затрымлівае ўтварэньне значных пралетарскіх кадраў у нацрэспубліках.

Тав. Багданаў (Паўночны Каўказ) адзначае, што лічбы, намечаныя пяцігадовым плянам для Паўночнага Каўказу, ніжэй тых, якія зазначаны ў пастанове лістападаўскага пленуму. Асыгнаваньні на сельскую гаспадарку зусім адпавядаюць удзельнай вазе Паўночнага Каўказу ў сельска-гаспадарчай прадукцыі Савецкага Саюзу.

Тав. Галадзед (БССР) зазначае на тое, што ўсе асноўныя дырэктывы партыі знашлі сваё ўвабасабленьне ў пяцігадовым пляне. Аднак, некаторыя акалічнасьці ўлічаны ня ў поўнай меры. Неабходна зьвярнуць больш увагі разьвіцьцю прамысловасьці і ўмацаваньню пралетарскай базы БССР, разьмеркаванай на нашай заходняй граніцы. Прамоўца зазначае на неабходнасьць рашучай барацьбы з панікёрскімі настроямі, якія выклікаюцца тымі цяжкасьцямі, якія нам даводзіцца перамагаць на шляху да сацыялістычнага будаўніцтва.

Тав. Перапечка (ДВК) таксама зазначае на неабходнасьць зьвярнуць больш увагі нашым акраінам і нацрэспублікам.

Рабочыя вітаюць партканфэрэнцыю.

МАСКВА, 25-4. Ня спыняюцца прысылацца прывітаньні XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі. Сход рабочых, служачых і інжынэрна-тэхнічнага складу паўночнай вэрфі ў Ленінградзе ў вытворчым рапарце канфэрэнцыі абавязуецца здаць сёлета ў экспляатацыю 7 караблёў, зьнізіць сабекошт, павялічыць прадукцыйнасьць працы. Сход рашуча адмятае ўсіх «правых» і «левых», якія імкнуцца сьцягнуць партыю з правільнага ленінскага напрамку і сарваць справу індустрыялізацыі краю. Рабочыя і служачыя суднабудаўні[illegible] юць упэўненасьць, што канфэрэнцыя павядзе самую рашучую барацьбу з асобамі, якія забываюць партыйную дысцыпліну. «Рабочыя заводу імя Марты,—зазначана ў прывітаньні,—стаяць на варце ленінскіх заваёў у барацьбе проці контр-рэвалюцыйнага трацкізму, правага ўхілу і прымірэнцтва». Такія-ж прывітаньні пасланы таксама ад партыйна-камсамольскага сходу фабрыкі «Организованый Труд» ва Уладзіміры, ад Кастрамское партарганізацыі, ад сходу Новарасійскага заводу „Красный Двигатель" і г. д.

Раніншняе пасяджэньне партканфэрэнцыі 25-га красавіка.

Т. Кодацкі (Ленінград), спыняецца на пытаньне аб ролі Ленінграду, як індустрыяльнае базы. У Ленінградзе ў першую ў Расеі ўдаўся вопыт вырабу алюмінія ў заводзкім абхваце. Пасьпехі з алюмініем высоўваюць задачу пабудовы спэцыяльнага заводу, каб закончыць так удала распачаты вопыт і ў бліжэйшы час мець магчымасьць наладзіць у нас выраб алюмінія ў шырокім заводзкім абхваце.

Неабходна культурнае ўзброеньне пралетарыяту.

Тав. Крыніцкі. Дзьве ўмовы неабходны для выкананьня вялікага пяцігадовага пляну. Першая ўмова—мабілізацыя самых шырокіх мас навакол задач сацыялістычнага будаўніцтва, другая задача—няшчадны адпор усім ваганьням пры правядзеньні генэральнай лініі партыі і, асабліва адпор праваму ўхілу. Гэтая другая ўмова ўжо выканана ў апошніх пастановах Цэнтральнага Камітэту партыі. Што-ж датычыць першае ўмовы—мабілізацыі мас, дык тут справа значна горшая. Пытаньні мабілізацыі мас шчыльна ўвязаны з усёю нашаю сацыяльна-культурнаю працаю. Гэтая праца, аднак, вельмі слаба ахоплена пяцігадовым плянам вялікіх работ. У пяцігодцы мы бачым поўную недаацэнку задач па мабілізацыі мас. Поўнага курсу на масы ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, якое адбілася ў лёзунгах культурнае рэвалюцыі, мы ў належна выразным выглядзе не знаходзім у пададзенай нам пяцігодцы. Справа ідзе пра культурнае ўзброеньне пралетарыяту ў яго клясавай барацьбе за сацыялістычныя шляхі разьвіцьця нашага краю. Якое-ж гэта ўзброеньне, калі да канца пяцігодкі мы будзем усё-ж такі мець дэфіцыты на дзесяткі тысяч інжынэраў, тэхнікаў, аграномаў, настаўнікаў. Неабходна грунтоўна абдумаць ізноў пяцігодку, каб больш рашуча і сьмела—у адпаведнасьці з лініяй партыі—стаць на рэйкі сапраўднае культурнае рэвалюцыі. Трэба перапрацаваць пяцігодку ў галіне культурных задач так, каб да канца яе мы ўжо ня мелі няпісьменных, ня мелі буйнае няхваткі спэцыялістаў і не адчувалі вострае патрэбы ў паперы.

Скрыпнік (Украіна) Пяцігадовы плян мае значэньне ня толькі для СССР, але і для ўсяго Камінтэрну, усяго міжнароднага пралетарыяту. Трэба яго лічбы шырока распаўсюджваць сярод міжнароднага пралетарыяту, каб ён нагляднa пераканаўся, што робіць пралетарыят СССР для пабудовы сацыялізму. Далей Скрыпнік востра крытыкуе «мінімалістычныя» устаноўкі дзяржаўнае плянавае камісіі ў адносінах культурнага будаўніцтва. Характэрна, што радыё ў пяцігодцы разглядаецца толькі як галіна сувязі, а не як магутная зброя культурнага выхаваньня мас.

Тав. Хлаплянкін (Ніжняя Волга) зазначае на недастаткова скончаную распрацоўку пляну ў раённым разрэзе. Тав. Хлаплянкін пацьвярджае ўплыў мэтадаў грамадзкага ўзьдзейнічаньня на кулацтва пры хлебазагатоўках. Гэтыя мэтады на некалькі міліёнаў пудоў павялічылі хлебазагатоўкі. Неабходна і надалей на спэкуляцыю кулака цьвёрда адказаць мэтадамі грамадзкага ўзьдзейнічаньня на яго.

Тав. Ціхан (Масква) зазначае на недахопы нашага будаўніцтва і гаворыць аб патрэбе перайсьці на стандартнае будаўніцтва.

Тав. Анцаловіч [Масква] высоўвае праблему лясное гаспадаркі, якая не знайшла ў пяцігодцы таго месца, якога лясная гаспадарка—па сваім значэньні—заслугоўвае. Лясная гаспадарка наладжана ў нас дрэнна. Трэба засноўваць лясныя гаспадаркі (лесгасы), даць людзей і капіталы, бо ўсе затраты апраўдаюцца з лішкам. Мала ўвагі, на думку Анцаловіча, аддаецца таксама і савгаснаму будаўніцтву. Час глядзець на савгасы, як на заводы і фабрыкі. У апошнія робіцца буйныя капітальныя ўклады, а савгасам даецца толькі банкаўскі крэдыт. Савгасы ня выканаюць сваіх заданьняў па пяцігодцы, калі не механізаваць і не машынізаваць іх поўнасьцю.

Тав. Любімаў (Масква) знаходзіць, што ў пяцігодцы мала аддадзена ўвагі каапэрацыі, якой ня дадзена належных матэр'яльных сродкаў. Да канца пяцігодкі крамная сетка каапэрацыі ўсё яшчэ застанецца ўдубальт меншаю за даваенную.

Тав. Мікалаева (Паўночны Каўказ) зазначае на тое, што цяжкасьці, якія нам даводзіцца перамагаць, зьвязаны з цяжкасьцямі ўздыму, а ня заняпаду. Падтрыманьне, якое давалі палітыцы партыі рабочыя масы і бяднацка-серадняцкія гушчы вёскі, сьведчаць аб тым, што партыя праводзіць правільную лінію.

Тав. Сухамлін (Украіна) гаворыць аб недастатковай выдачы сродкаў на навуковыя досьледы і перспэктывы. Пасыўныя навуковыя досьледы павінны быць перанесены ў цэнтр вытворчасьці.

Апроч таго, у спрэчках выступілі т.т. Якаўлева (Масква), Уралаў (Масква, Наркамзем РСФСР), Косараў (ЦК УсеЛКСМ), Разанаў (Масква).

На вячэрнім пасяджэньні 25-га красавіка ў спрэчках выступалі Бэргвінаў (Паўночны Каўказ), Мілюцін (Масква), Мірзаян (Закаўказьзе), Уладзімірскі (Масква), Уншліхт (Масква) і Аралаў (Масква).

Пасьля прамовы т. Аралава спрэчкі былі спынены.

Тав. Кржыжаноўскі выступае на вячэрнім пасяджэньні 25-га красавіка з заключным словам. Пасьля гэтага канфэрэнцыя аднагалосна ўхваліла прапанаваныя пленумам ЦК УсеКП(б) тэзісы аб пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі.

Раніцою 26-га красавіка канфэрэнцыя заслухае даклад т. Калініна аб шляхох уздыму сельскае гаспадаркі і падатковым абкладаньні серадняка.

Дзеньнік канфэрэнцыі.

МАСКВА, 25-4. На раніншнім пасяджэньні ўсесаюзнае партканфэрэнцыі 25-га красавіка пад старшынствам т. Пятроўскага адбываліся далей спрэчкі па дакладах аб пяцігадовым пляне народнае гаспадаркі.

У спрэчках выступалі т. т. Бабацкі (Ленінград), Крыніцкі (Масква), Скрыпнік (Украіна), Хлаплянкін (Ніжня-Волскі край), Ціхан (Масква), Анцаловіч (Масква), Любімаў (Масква), Мікалаева (Паўночны Каўказ), Сухамлін (Украіна), Якаўлева (Масква), Муралаў (Масква), Косараў (ЦК УсеЛКСМ) і Разанаў (Масква).

На Жэнеўскай камісіі „разброеньня"

Нямецкі праэкт таксама праваліўся.

Выступленьне польскага дэлегата Сокаля.

ЖЭНЕВА, 24-4. У падрыхтоўчай камісіі аб разброеньні ў спрэчках па ўзьнятым нямецкім дэлегатам Бэрнсдорфам пытаньні аб паветранай хімічнай вайне выступіў польскі дэлегат Сокаль. Сокаль прызнае моцнасьць довадаў наконт паветранае хімічнае вайны, пададзеных Бэрнсдорфам (Бэрнсдорф, між іншым, спасылаецца на погляд спэцыялістаў, згодна якога бамбардыроўка буйнае эўрапэйскае сталіцы авіяхімічнымі сродкамі на працягу некалькіх гадзін будзе мець у выніку бліжка поўнае зьнішчэньне ахвяр), але лічыць, аднак, „немэтазгодным забараняць адзін з спосабаў вайны, паколькі пактам Келёга ўжо забаронена ўсякая вайна".

Гэта выступленьне выклікала сьмех часткі публікі і дало повад Літвінаву выкрыць двайстасьць выступленьняў Сокаля.

Польскі дэлегат Сокаль у паўторным адказе Літвінаву бяз посьпеху імкнецца замазаць супярэчнасьці між першаю і другою прамоваю.

У далейшым навакол нямецкае прапановы разгортваецца вялікая дыскусія, у якой бяруць удзел Кешэндэн і іншыя. Не зважаючы на розныя манэўры, Лёудону давядзіцца ставіць на галасаваньне нямецкую прапанову, якая адхіляецца ўсімі галасамі проці галасоў Нямеччыны, СССР, Кітаю, Галяндыі і Швэцыі. Жадаючы выручыць камісію, якая трапіла ў скандальнае становішча, грэцкі дэлегат Політыс прапануе дэлегацыям, якія галасавалі проці нямецкае прапановы, ухваліць такую рэзалюцыю: „Выказаўшыся проці нямецкае прапановы, тым самым ня зьбіраецца дазволіць ужываць паветранае бамбардыроўкі проці мірнага насельніцтва".

Тав. Літвінаў рашуча супярэчыць проці такіх манэўраў і выказу асабовых пачуцьцяў і сымпатый і падкрэсьлівае, што вынікамі галасаваньня ўстаноўлена нежаданьне ўраду ўзяць на сябе абавязацельствы ў адносінах паветранае бамбардыроўкі.

Прапанова Політыса ўхваляецца галасамі ўсіх дэлегацый, якія галасавалі проці нямецкае прапановы.

Тав. Літвінаў выкрывае двайстасьць польскае дэлегацыі.

ЖЭНЕВА, 24-4. У адказе дэлегату Польшчы Сокалю старшыня савецкае дэлегацыі тав. ЛІТВІНАЎ, між іншым, заяўляе:

„Дэлегат Польшчы Сокаль зварочвае нашу ўвагу на тое, што хоць амаль усе дзяржавы падпісалі пакт Келёга аб адмове ад вайны, аднак, падрыхтоўчая камісія займаецца абмеркаваньнем мэтадаў вядзеньня вайны. СОКАЛЬ ЛІЧЫЎ ЗА ЛЕПШАЕ НЕ ЗАЗНАЧАЦЬ НА ГЭТЫЯ РАЗУМЕНЬНІ ПРЫ НАЛЕЖНЫМ АБМЕРКАВАНЬНІ ПЫТАНЬНЯ АБ ЗАБАРОНЕ ХІМІЧНАЕ ВАЙНЫ. ЁН УСТРЫМЛІВАЕЦЦА ТАКСАМА АД ПРЫСТАСАВАНЬНЯ ГЭТАГА ПУНКТУ ГЛЕДЖАНЬНЯ ДА ПЫТАНЬНЯ АБ СКАРАЧЭНЬНІ ЎЗБРОЕНЬНЯ. Ён ва ўсіх пытае, навошта займацца скарачэньнем узбраеньня, калі вайна ў будучым немагчыма. Савецкая дэлегацыя робіць з пакту Келёга вывад, што ўсе ўзбраеньні павінны быць зьнішчаны. Маючы іменна гэтую мэту, савецкая дэлегацыя яшчэ летась прапанавала поўнае ўсеагульнае разбраеньне. НАЖАЛЬ, ЯКРАЗ ПРАДСТАЎНІК СУСЕДНЯЕ З НАМІ ПОЛЬСКАЕ ДЗЯРЖАВЫ НЯ МАЛА СПРЫЯЎ АДХІЛЕНЬНЮ САВЕЦКАЕ ПРАПАНОВЫ АБ ПОЎНЫМ РАЗБРАЕНЬНІ. Падрыхтоўчая камісія адхіліла нават новыя савецкія прапановы, заявіўшы, што, не зважаючы на ўрачыстыя абавязацельствы, якія выплываюць з пакту Келёга, мы, як і раней, павінны лічыцца з магчымасьцямі вайны. З гэтае прычыны мы, натуральна, павінны вярнуцца да заходаў, якія зьмяншаюць гэтыя магчымасьці, або прынамсі, зьмякчаюць жахі вайны.

Савецкая дэлегацыя, зразумела, цалкам падтрымлівае нямецкую прапанову.

Тав. ЛІТВІНАЎ у новым выступленьні падкрэсьлівае вострую супярэчнасьць між першым і другім выступленьнем Сокаля. Адказваючы Масільлі, Літвінаў падкрэсьлівае, што забарона хімічнае вайны лёгічна патрабуе забароны і паветранае хімічнае вайны. Далей, у зьвязку з зазначэньнямі некаторых дэлегатаў на «неабходнасьць лічыцца з грамадзкаю думкаю», Літвінаў заяўляе, што сябром Лігі Нацый ужо даводзілася ўлічваць нажым грамадзкае думкі, паколькі (8-мы артыкул статуту Лігі Нацый і ініцыятыва скліку канфэрэнцыі аб разбраеньні зьяўляецца не выяўленьнем волі ўраду, а ўступкамі грамадзкай думцы (арт. 8 статуту Лігі Нацый гаворыць аб неабходнасьці абмежаваньня ўзбраеньняў і даручае радзе Лігі падрыхтоўку праэктаў абмежаваньня ўзбраеньняў). Пра апошняе нельга забываць пры абмеркаваньні канкрэтных прапаноў. ТАВ. ЛІТВІНАЎ АДЗНАЧАЕ, ШТО ЗА 10 ДЗЁН СЭСІЯ ПАДРЫХТОЎЧАЕ КАМІСІІ НЯ ТОЛЬКІ НЕ ЎХВАЛІЛА НІВОДНАЕ СТАНОЎЧАЕ ПАСТАНОВЫ, АЛЕ ПАСТУПОВА АДХІЛЯЛА ЯК ВЫСУНУТЫЯ САВЕЦКАЙ ДЭЛЕГАЦЫЯЙ АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ РАЗБРОЕНЬНЯ, ТАК І КАНКРЭТНЫЯ ПРАПАНОВЫ АБ ЛІКВІДАЦЫІ СРОДКАЎ ВЯДЗЕНЬНЯ ХІМІЧНАЕ ВАЙНЫ, А ЗАРАЗ ЗЬБІРАЕЦЦА АДХІЛІЦЬ НЯМЕЦКУЮ ПРАПАНОВУ, ЯКУЮ ПАДТРЫМЛІВАЕ І САВЕЦКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ, АБ ЗАБАРОНЕ ПАВЕТРАНАЕ ХІМІЧНАЕ ВАЙНЫ.

Спрэчкі і галасаваньне нямецкага праэкту.

Француcкі дэлегат Масільлі выступае супроць прапановы Бэрнсдорфа і заяўляе, што абарона цывільнага насельніцтва не ўваходзіць у задачы камісіі.

Нямецкі дэлегат Бэрнсдорф не адступае ад таго, што нямецкая прапанова адпавядае задачам камісіі. Далей, Бэрнсдорф зазначае, што нямецкі ўрад лічыць, што пакт Келёга не выключае, а наадварот, патрабуе абмяркоўваць пытаньне аб скарачэньні ўзбраеньняў і зьнішчэньня ў першую чаргу тых сродкаў вайны, якія зьяўляюцца сродкам для нападу і больш за ўсё пагражаюць мірнаму насельніцтву.

Сокаль у выразнай супярэчнасьці з сваім першым выступленьнем, дзе ён казаў, што лічыць „немэтазгодным забараняць адзін з спосабаў вайны, паколькі пактам Келёга ўжо забаронена ўсякая вайна" (гэта выклікала сьмех у часткі публікі), зараз «растлумачвае», што паколькі пакт Келёга не забясьпечвае поўнае безапаснасьці, варта ўсё-ж такі займацца ў поўнай асьцярожнай меры частковым абмежаваньнем узбраеньняў, улічваючы пытаньне аб ступені безапаснасьці кожнага краю.

Дэлегацыя Злучаных Штатаў супярэчыць проці нямецкае прапановы, заяўляючы, што лічыць заўчасным абмяркоўваць складаную праблему вайсковае авіяцыі.

Рэвалюцыйны і забастовачны рух за мяжой

Барацьба за 1-е мая.

Супроць забароны першамайскіх дэманстрацый

БЭРЛІН. За апошнія дні агульныя сходы цэлага шэрагу новых прадпрыёмстваў ухвалілі рэзалюцыі пратэсту супроць забароны першамайскіх дэманстрацый сацыял-дэмакратычным паліцэй-прэзыдэнтам Цэргібелем. На ўсіх прадпрыёмствах абраны першамайскія камітэты. Рабочыя клянуцца прыняць удзел у першамайскіх дэманстрацыях на перакор забароне сацыял-дэмакратычных міністраў. Фабком электрычнага прадпрыёмства «Осрам-Вэрке», у які ўваходзяць таксама сацыял-дэмакратычныя члены, аднагалосна патрабуе адмены забароны дэманстрацый.

«Ротэ Фанэ» агаласіла сакрэтны загад начальніка бэрлінскай паліцыі палкоўніка Гайманзбэрга аб супрацоўніцтве паліцэйскіх з „цывільнымі асьведаміцелямі". «Ротэ Фанэ» зазначае, што задача гэтых цывільных асьведаміцеляў—правакацыйны зрыў дэманстрацый. (ТАСС).

* * *

ВЕНА, 24-4. Югаслаўскі ўрад забараніў першамайскую дэманстрацыю.

Каб не патурбаваць міністра.

ВЕНА, 24-4. Вэнгерскі міністр унутраных спраў адхіліў хадайніцтва сацыял-дэмакратаў аб дазволе першамайскае дэманстрацыі. Сваю забарону ён абгрунтаваў тым, што 1-га мая прыяжджае ў Будапэшт таварыш італьянскага міністра замежных спраў Гранды, „таму нельга, каб вулічныя дэманстрацыі перашкодзілі яго ўрачыстаму прыёму".

Новае ўзмацненьне шэрагаў чырвонага саюзу франтавікоў.

БЭРЛІН. Падрыхтоўка пятага ўсенямецкага збору чырвонага саюзу франтавікоў, які адбудзецца ў Гамбурзе, праводзіцца з выключным посьпехам як у сэнсе ўзмацненьня аўтарытэту саюзу, так і прытоку новых членаў. Асабліва паказальна ўзмацненьне ўплыву чырвонага саюзу франтавікоў у тых раёнах, якія нядаўна яшчэ былі цьвярдынямі рэакцыі і рэфармізму. Так, у адной толькі Усходняй Прусіі за апошнія тыдні ў чырвоны саюз франтавікоў уступіла звыш 400 новых членаў, пераважна з сялян. Ня спыняецца прыток новых членаў і ў прамысловых раёнах. Аб гэтым сьведчаць паведамленьні з Рурскай вобласьці, Гамбургу і Бэрлін-Брандэнбурскай правінцыі.

На прадпрыёмствах з вялікім посьпехам ня спыняецца кампанія за перадачу чырвоным саюзам франтавікоў Камінтэрну падарунку—3 грузавікоў, якія будуць накіраваны ў Маскву, Харкаў і Растоў на Доне. (ТАСС)

Забастоўка амэрыканскіх тэкстыльшчыкаў пашыраецца.

НЬЮ-ЁРК, 23-4. У Гастоніі ня спыняюцца стычкі пікетаў тэкстыльнае стачкі з паліцыяй. Разганяючы пікеты, паліцыя пусьціла ў ход штыкі і параніла некалькі рабочых. Арыштавана 29 чалавек, у тым ліку арганізатар левага саюзу тэкстыльшчыкаў. Бастуючыя наладжваюць дэманстрацыі, хоць паліцыя і забараніла розныя «працэсіі». Левыя наладжваюць рух у ваколічных фабрыках. Забастоўка пашыраецца.

Наскокі паліцыі на рабочых Аўстрыі.

ВЕНА. У прамысловым гарадку Кнітэльфэльд у (Штырыі) гэтымі днямі здарылася буйная стычка між рабочымі і хэймвэрамі. Пад Кнітэльфэльдам хэймвэры сарвалі два сходы. Пась[illegible] бінкамі і рэвальвэрамі, дэманстратыўна прайшлі каля рабочага дому і правакавалі рабочых, якія знаходзіліся там з жонкамі і дзецьмі. Справа дайшла да стычкі. 6 хэймвэраў і 1 рабочы [illegible]

Забастовачны рух Францыі ў сакавіку.

ПАРЫЖ. Орган кампартыі «Юманітэ» паведамляе, што ў сакавіку ў Францыі адбылося 160 забастовак, у якіх прынялі ўдзел 4.855 рабочых. У лютым здарылася 49 забастовак—бастававала 5130 рабочых.

На першым месцы ў забастовачным руху ў сакавіку стаяць мэталёўцы (16.600), на другім—тэкстыльшчыкі (15.285). Транспартных рабочых баставала 4 тысячы, будаўнічых — 3.040. партавых рабочых—3.512.

З 160 забастовак 52 скончыліся перамогаю рабочых. 84 забастоўкі ня спыняліся і ў красавіку.

119 забастовак былі выклікаканы патрабаваньнямі рабочых аб павялічэньні заработку. Было больш 20-ці выпадкаў, калі забаставалі з салідарнасьці.

Новыя выключэньні з нямецкіх прафсаюзаў.

БЭРЛІН. Бюракратычная верхавіна рэфармісцкіх прафсаюзаў ня спыняе ўціскаць прыхільнікаў рэвалюцыйнага крыла. Усе кандыдаты, высунутыя па сьпісу рэвалюцыйнага крыла на перавыбарах фабрычна-заводзкіх камітэтаў на прадпрыёмствах «Леўн-Вэрке», будуць выключаны з саюзу. Справа ідзе аб 30-ці пралетарыях, якія знаходзяцца ў прафсаюзе дзесяткі гадоў. Прыхільнікі рэвалюцыйнага крыла на прадпрыёмствах «Леўна Вэрке» былі ўжо раней выключаны з саюзу. Гэтыя выключэньні—помста рэфарміcтаў за паражэньне на перавыбарах фабрычна-заводзкага камітэту на самым буйным хімічным прадпрыёмстве Нямеччыны, якім зьяўляецца «Леўна Вэрке». Асабліва цікавым зьяўляецца выключэньне з саюзу Цыгера, абранага па сьпісу рэвалюцыйнага крыла сябром фабрычна-заводзкага камітэту, а потым старшынёю фабрычна-заводзкага камітэту. Цыгер, які быў 40 гадоў у прафсаюзе дрэваапрацоўчнікаў, выключаецца рэфармісцкай бюракратыяй з саюзу за тое, што ён на перавыбарах фабрычнага камітэту адкрыта змагаў[illegible]

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Становішча прафсаюзаў на акраінах Польшчы

ВАРШАВА, 18-4. Калі становішча прафсаюзнага руху ў Польшчы наогул незайздросна, дык на акраінах яно робіцца проста нязносным. Улада імкнецца ўсялякім чынам зьменшыць правы прафсаюзаў і перашкодзіць іх дзейнасьці. Доказам гэтага можа служыць наступны факт. Каля паўтара гадоў таму назад улада на крэсах успомніла аб старым загадзе генэральнага камісара ўсходніх абласьцяў, забараняючым асобам да 21-году быць членамі грамадзкіх арганізацый. На падставе гэтага загаду ўлада патрабавала выключыць з прафсаюзаў усіх членаў ва ўзросьце да 21-га году. Калі прыняць пад увагу, што ў шэрагу прафсаюзаў большасьць членаў складаюць маладыя рабочыя, дык зразумела, што гэты загад азначаў зрываньне прафруху. Аб'яднаньне прафсаюзаў абскардзіла гэты загад. Толькі зараз праз 14 месяцаў атрымаўся наступны саламонаўскі адказ: «Міністэрства дазваляе маладым рабочым быць членамі прафсаюзаў, але бяз права голасу». Зразумела, такая пастанова міністэрства не распаўсюджваецца на прафсаюзы карэннай Польшчы. (ТАСС).

Рабочых выкідаюць з кватэр.

У зьвязку з крызісам і беспрацоўем у Лодзі ўсё больш частымі робяцца выпадкі, што дамаўласьнікі выкідаюць рабочых з кватэр.

Гэтымі днямі дамаўласьнік Сулкоўскі загадаў 8 рабочым выселіцца з займаемых імі кватэр. Адзін з высяляемых рабочых, Елонак, адмовіўся падначаліцца, тады Сулкоўскі выкінуў яго рэчы і замкнуў кватэру. Калі рабочыя выходзілі з фабрык, на двары дому Сулкоўскага сабраўся натоўп рабочых, які запатрабаваў усяленьня Елонка назад у кватэру. Сулкоўскі схапіў рэвальвэр і стрэлам параніў аднаго рабочага.

На дапамогу ўласьніку прышла паліцыя, якая стрэламі прымусіла рабочых разысьціся. Сулкоўскі нават ня быў арыштаваны.

Эпідэмія самагубстваў.

83 САМАГУБСТВЫ Ў ВАРШАВЕ Ў ПРАЦЯГУ САКАВІКА.

У працягу сакавіка месяца ў Варшаве рабілі замах на самагубства 83 чалавекі, з іх 23 кончыліся сьмерцю.

НА ПРАВІНЦЫІ.

17-га красавіка пакончыла самагубствам (атруцілася) сялянка Тужына—33 год з вёскі Кузьніцы, Дзісьненскага павету.

* * *

У лесе, каля маёнтку Пятроўшчына знойдзен труп невядомага мужчыны. Мэдыцынскае абсьледаваньне выявіла атручэньне карболкай.

* * *

18-га красавіка перарэзаў сабе горла брытвай жыхар вёскі Давілавіч—60-цігадовы мужчына Дунец.

Хто забойца Лібкнэхта.

БЭРЛІН, 23-4. Сьведка Рунге, які выступаў на працэсе рэдактара радыкальнага штотыднёвіка «Тагебух», мае зараз, як выявілася, прозьвішча Радольф. Пры забойстве Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург Рунге, які быў тады салдатам егерскага палка, першым выцяў іх прыкладам вінтоўкі. Пасьля забойства, Рунге, з дазволу ўлады, афіцыйна зьмяніў прозьвішча.

Міністэрскі крызіс у Аўстрыі.

ВЕНА, 23-4. Водлуг вестак парляманцкіх колаў, галава краявога ўраду Фаральзбэргу Эндаль канчаткова адмовіўся заняць пасаду галавы будучага агульна-аўстрыйскага ўраду. З гэтае прычыны хрысьціянская сацыяльная партыя прапануе абедзьвюм партыям ранейшае кааліцыі (пан-германцам і ляндбунду) кандыдатуру прафэсара Мітальбэргера, міністра фінансаў—Фаральзбэрга.

Шырэй сацыялістычнае спаборніцтва!

(З адозвы прэзыдыуму ЦСПСБ).

Пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі, які мы зараз перажываем, і пастаўленыя кампартыяй і ўрадам перад рабочай клясай задачы па максымальным разьвіцьці сацыялістычнай прамысловасьці і ўсёе нашай народнай гаспадаркі, патрабуюць яшчэ большага прыцягненьня да актыўнага і сьвядомага ўдзелу ў будаўніцтве ўсёй пралетарскай масы.

Па ініцыятыве пралетарскіх мас па ўсім СССР у апошні час шырока разгарнуліся дагаворы пралетарскіх мас па правядзеньню сацыялістычнага спаборніцтва па ўзьняцьці вытворчасьці працы, зьніжэньні сабекошту і падняцьці працоўнай дысцыпліны.

Сацыялістычнае спаборніцтва зьяўляецца новым уздымам творчай ініцыятывы мас для пасьпяховага выражэньня важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Прэзыдыум ЦСПСБ са здавальненьнем сьцьвярджае, што гэты пралетарскі ўздым паступова ахоплівае таксама і рабочых БССР. Менская агульнагарадзкая рабочая канфэрэнцыя, якая адбылася ў красавіку г.г., прайшла пад знакам глыбокага разуменьня рабочымі Меншчыны перажываемых намі цяжкасьцяў і вызначэньня практычных мерапрыёмстваў для іх зьнішчэньня. На гэтай канфэрэнцыі адбыўся масавы дагавор 2 дэлегацый рабочых заводаў «Камунар» і «Энэргія» па правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва. Высокую пралетарскую сьвядомасьць выявілі таксама рабочыя віцебскіх заводаў «Чырвоны Мэталіст» і «Камінтэрн», якія заключылі гаспадарча-палітычны дагавор з гаспадарчымі органамі і ўрадам.

Весткі з месц сьведчаць аб тым, што і па іншых акругах рабочыя масы выяўляюць высокую сьвядомасьць і ініцыятыву для зьнішчэньня цяжкасьцяў, якія стаяць на шляху разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва.

Прэзыдыум ЦСПСБ заклікае ўсе саюзныя арганізацыі аддаць максымум увагі правядзеньню сацыялістычнага спаборніцтва, скарыстаўшы ўсе магчымасьці для шырокай папулярызацыі сярод рабочых мас мэтадаў і задач сацыялістычнага спаборніцтва і аказаць канкрэтную дапамогу мясцом у арганізацыі спаборніцтваў.

Надаючы вялізарнае палітычнае і эканамічнае значэньне сацыялістычнаму спаборніцтву, прэзыдыум ЦСПСБ прапануе ўсім прафсаюзным арганізацыям яшчэ шырэй разгарнуць працу па правядзеньні масавых пралетарскіх дагавораў, максымальна ўцягваючы ў іх шырокія рабочыя масы. Сацыялістычнае спаборніцтва можа быць праведзена як паміж асобнымі прадпрыёмствамі, так і паміж асобнымі цэхамі, брыгадамі, аддзяленьнямі, групамі і нават асобнымі рабочымі вытворчасьці.

Дзеля папулярызацыі задач сацыялістычнага спаборніцтва і ўцягненьня ў яго шырокіх рабочых мас неабходна скарыстаць мэтады, якія апраўдалі сябе ў часе агляду вытворчых нарад (гутаркі, сходы, выданьне газэт і інш.). У часе правядзеньня спаборніцтва павінны шырока асьвятляцца перад рабочымі масамі агульна-завадзкія і цэхавыя паказальнікі вытворчасьці працы.

Адначасова з гэтым неабходна аказваць усямернае садзейнічаньне прамысловаму паходу камсамолу, уцягваючы і дарослых рабочых у брыгады рабочай моладзі, якія арганізуюцца камсамолам.

Неабходна таксама на пасяджэньнях завкомаў, рабочых сходах, вытворчых нарадах, і пасяджэньнях акруговых праўленьняў саюзаў, ЦП і Акрпрафбюро рабіць даклады аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва, прымаючы захады да адхіленьня прычын, якія перашкаджаюць ажыцьцяўленьню заданьняў, вызначавых сацыялістычным спаборніцтвам.

ДА ЧЫСТКІ ПАРТЫІ.

Не дапушчаць шаблёну ў складаньні ячэйкавых характарыстык

На вытворчасьці, у вёсцы, у дзяржаўных і грамадзкіх арганізацыях умовы працы партыйных ячэек розныя. Гэта розьніца ўмоў і задач партыйнай працы патрабуе ад праверачных камісій у часе чысткі living падыходу і мэтадаў, каб ахапіць важнейшыя дырэктывы партыі, якія адносяцца да асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва, і адначасова з гэтым у кожнай катэгорыі ячэек праверыць спэцыяльныя дырэктывы. Так, дырэктывы партыі аб задачах рацыяналізацыі вытворчасьці, зьніжэньня сабекошту, павышэньня працоўнай дысцыпліны— для вытворчых ячэек; аб задачах барацьбы з бюракратызмам, валакітай, выкрыўленьнем клясавай лініі—для савецкіх ячэек; аб задачах калектывізацыі, вытворчага каапэраваньня, працы з беднатой—для вясковых ячэек і г. д.

Апрача таго, ва ўсіх ячэйках (вытворчых, вясковых, савецкіх, вузаўскіх) будзе зьвернута асаблівая ўвага на праверку якасьці масавай работы, на якасьць кіраўніцтва масавымі арганізацыямі.

Каб палегчыць працу праверачных камісій, каб дапамагчы ім найпаўней ацаніць дзейнасьць асобных ячэек, выкрыць у працы недахопы і дапамагчы іх ячэйкам выправіць, вялікае значэньне набывае складаньне ячэйкавых характарыстык. Да гэтай падрыхтоўчай працы РК і ячэйкі пад кіраўніцтвам АКК і АК павінны аднесьціся вельмі ўважліва і ў сьціслай форме, як гаворыцца ў лісьце ЦК і ЦКК КП(б)Б, адбіць усе станоўчыя і адмоўныя бакі адпаведна ўмовам працы асобных ячэек. На практыцы-ж праца гэта ў шэрагу месц выконваецца ня зусім дабраякасна, нават фармальна. Азнаямленьне са складзенымі ўжо характарыстыкамі некаторых ячэек проста такі гаворыць, што ад іх праверачныя камісіі возьмуць мала, калі ня будуць унесены карэктывы.

Вось некалькі прыкладаў з практыкі Мазырскай арганізацыі. Характарыстыка ячэйкі акрана па абслугоўваньню культурных устаноў г. Мазыра. „Усяго камуністаў 30, з іх членаў 24, канд.—6. Па сацыяльнаму становішчу: —рабочых—13, сялян—1, служачых—15, выхадцаў з іншых партый—3; ячэйка абслугоўвае культурна-асьветныя ўстановы гораду. У асноўным ячэйка здаровая, палітпадрыхтаваная. Процант прыцягнутых да адказнасьці—7. Партыйныя дырэктывы пераламляюцца правільна“.

Вытворчая ячэйка зав. «Пралетары». «Усяго камуністаў—49, з іх членаў партыі—35, канд.—14. Па складу: рабочых ад варштату—41, выхадцаў з іншых партый—3. Ячэйка абслугоўвае завод—270 рабочых. У асноўным ячэйка здаровая. Па свайму стажу маладая. Рост ячэйкі нездавальняючы. Агульнае палітразьвіцьцё ячэйкі слабое. Ёсьць моманты цэхаўшчыны і сялянскіх настрояў. Недысцыплінавана. Процант прыцягнутых да партыйных спагнаньняў да агульнай колькасьці складу ячэйкі—10».

І, нарэшце, мяшаная вясковая Асташоўская ячэйка «ў сваім складзе налічвае 10 членаў і 3 канд. Склад ячэйкі палітычна разьвіты слаба; слаба вядзецца ўнутрывыхаваўчая праца, а таксама слаба вядзецца культурна-масавая праца, з прычыны таго, што кіраўнічы склад ячэйкі (бюро) мала падрыхтаваны. Агульная праца ячэйкі кульгае, і ёсьць нездаровыя моманты— склочніцтва, выпіўкі, антысэмітызм і інш; не разгорнута праца па ўцягненьню ў партыю рабочых і батракоў. Неабходна ўжыць сур'ёзныя меры да аздараўленьня ячэйкі, узмацніўшы выхаваўчую працу“.

Узятыя, як прыклад, тры ячэйкавыя характарыстыкі—на савецкую, вытворчую і мяшаную вясковую—гавораць, што ў іх адсутнічаюць такія моманты, як характарыстыка масавасьці працы, барацьбы з бюракратызмам і валакіта (ячэйка Акрана); адсутнічае характарыстыка выкананьня дырэктыў партыі па рацыяналізацыі вытворчасьці, узьняцьці працоўнай дысцыпліны на заводзе (зав. «Пралетары»), а ў характарыстыцы вясковай ячэйкі зусім абмінуты момант вытворчага каапэраваньня і калектывізацыі і аб тым, як праводзіцца праца з беднатой. У характарыстыцы ўсіх 3-х ячэек не асьветлена ідэалёгічнае становішча партыйцаў, нічога не гаворыцца аб тым, якое было кіраўніцтва ячэйкамі з боку райкомаў.

Усё гэта вельмі важна ў кароткай форме паказаць у характарыстыках ячэек; важна таксама коротка адбіць і тое, пад уплывам якіх прычын маюць месца тыя ці іншыя хваравітыя зьявішчы ў ячэйках.

Зараз, пакуль ня позна, неабходна ўлічыць гэтыя недахопы ў падрыхтоўцы характарыстык і старацца іх выправіць. Паўтараем, гэтым максымальна будзе палегчана праца праверачных камісій.

М. Ляўкоў.

І ёсьць і няма ячэйкі.

(Крупскі раён, Аршанскай акр.).

Выдрыцкая ячэйка складаецца з трох членаў партыі і аднаго кандыдата; фактычна-ж сходы адбываюцца пры наяўнасьці двох членаў і аднаго кандыдата, бо адзін член партыі зьяўляецца старшынёю Ухвальскага спажывецкага т-ва і ўжо тры м-цы ня быў на сходзе.

Трэба адзначыць, што сакратар ячэйкі вельмі неаўтарытэтная асоба сярод сялянства, няправільна праводзіць клясавую лінію ў адносінах сялянства, вось чаму ячэйка амаль ніякага ўплыву ня мае на вакольнае жыцьцё і на сялянства і ня мае вакол сябе актыву.

Падтрыманьне ў працы для правядзеньня розных мерапрыёмстваў магла-б аказаць камсамольская ячэйка, але кіраўніцтва працаю апошняй з боку партыйнай ячэйкі няма, з прычыны чаго назіраюцца сярод КСМ вельмі нездаровыя зьявішчы. Сакратаром ячэйкі КСМ зьяўляецца зусім палітычна няпісьменны хлапец, які фактычна лічыцца мэханічна выбыўшым з КСМ, як нарадж. 1903 году, а кандыдатам партыі яго не зацьвердзілі. Вядома, што пры такім становішчы і ў КСМ ячэйцы працы няма.

Цікава адзначыць, што да апошняга часу ніхто з раёну ня прыехаў і не дапамог наладзіць справу, а калі нават і прыяжджалі працаўнікі, то па кампанейскіх пытаньнях.

Трэба ці ліквідаваць ячэйку пры такім складзе, ці дапамагчы ёй наладзіць працу.

Анічул З.

Рыхтуемся да чысткі.

(Смалявічы, Меншчына).

Пытаньне чысткі партыі было абгаворана ў пачатку красавіка на раённым партыйным сходзе; цяпер гэта пытаньне абгаварваецца на адчыненых сходах ячэек.

На адчыненым сходзе Жодзінскай ячэйкі КП(б)Б стаяў даклад аб чыстцы партыі. Аб сходзе загадзя былі паведамлены рабочыя саўгасу, чыгункі і насельніцтва. Сход адчыніўся пры перапоўненай партыйцамі, камсамольцамі і беспартыйнымі хаце-чытальні; быў заслухан даклад апорга РК КП(б)Б аб чыстцы партыі, пасьля чаго пачалі задаваць пытаньні.

Характэрна адзначыць, што толькі 7 пытаньняў задалі партыйцы, а 24— беспартыйныя рабочыя і сяляне.

У спрэчках выступілі 15 таварышоў, з якіх партыйцаў 5, а астатнія —беспартыйныя рабочыя і сяляне.

Вось што яны сказалі ў спрэчках:

— Трэба дзякаваць, што партыя праводзіць чыстку, гэтым самым яна ажывіць работу ячэек,—кажа рабочы саўгасу «Зарэчча» Гракові.

А рабочы саўгасу Грышкін кажа: «У 1927 г. мы хацелі ўступіць у партыю, але ўбачылі, што партыйцы п'юць, і таму мы ня ўступілі».

Выступаўшыя ў спрэчках сяляне скардзіліся на ячэйку за тое, што яна нічога не зрабіла ў справе калектывізацыі, з прычыны чаго на тэрыторыі сельсавету няма ніводнага калектыву, а Жодзінскі сельсавет лічыцца самым вялікім у Смалявіцкім раёне.

Пры дапамозе рабочых, батракоў і сялян-беднякоў наша партыя зможа ачысьціцца ад нягодных элемэнтаў і папоўніць свае шэрагі за лік лепшай часткі рабочых, батракоў і сялян-беднякоў.

Б. Маркевіч.

Не дапусьціць у партыю.

(Калінкавіцкі раён, Мазыршчына).

Тры асобы: Явка У. Сыч, Лазарэўскі Е. Р. і Есьман Т. С. уступаюць у камуністычную партыю праз Мала-Луцюцэвіцкую ячэйку. Усе тры, як на падбор.

Сыч быў нават у камсамоле, але калі трэба пахаваць дзіця ці адзначыць яго нараджэньне, дык Сыч тады не камсамолец—ён мае справу з папом. Сыч, між іншым, стары самагоншчык, і калі вып'е—мора па калені. Сарваў жа ён, будучы п'яным, спэктакль у Аляксандраўскай школе ў часе сьвяткаваньня 10-годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Другі—Лазарэўскі, растратчык грамадзкіх грошай у в. Аляксандраўка. Гэты тып вельмі любіць таксама хрысьціць сваіх дзетак і быць кумам у добрага суседа.

Трэці—Есьман—быў пад судом за падлогі ў складаньні страхавых актаў і атрыманьні за гэта з дзяржаўных органаў грошай. За гэта ён быў пад судом, атрымаў тры гады ўмоўна. Ён, між іншым, загадваў аддзяленьнем пошты, дзе зрабіў растрату. Наогул, гэта тып з крымінальным мінулым.

Пытаньне: няўжо крымінальнікі будуць прыняты ў партыю? Нам здаецца, што партыя гэтага не дапусьціць —такім няма месца ў партыі. Партыя ня толькі ня можа дапусьціць крымінальнікаў у свае шэрагі, яна ня можа дапусьціць і гультаёў, якім зьяўляецца Сыч. Ён мае $^1/_6$ частку надзелу зямлі, прычым нават і паловы свае зямлі не засявае.

Чыгуначнік.

Адрас былому старшыні.

— Мы, адказныя і тэхнічныя супрацоўнікі Талочынскага райвыканкому, Аршанскай акругі, Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, выказваем глыбокі сум і незахаваны жаль з прычыны перакіданьня ў другі раён нашага дарагога і паважанага старшыні Сінічкіна.

Вы, дарагі і паважаны былы старшыня Сінічкін, за год сумленнай працы ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва выявілі сябе разумным, старанным і рупным гаспадаром. Мы не запамяталі, як вы дамагаліся на кожным пасяджэньні больш вялікага выдаткаваньня грашовых сродкаў на эканамічнае адраджэньне краіны, і як у фінансавай кніжцы, супроць графы— „непрадбачаныя выдаткі“—было напісана зладзейскім почаркам: «выдана Сінічкіну дапамога на падтрыманьне цяжкага матар'яльнага становішча ў суме 250 руб.».

А ў другой графе—«выдаткаваньне сродкаў на рамонт камунальных будынкаў» таксама на ваша шаноўнае прозьвішча запісана 300 руб. Бязумоўна, мы таксама ведаем, што гэтыя грошы пашлі на прыватны дом, належачы грамадзяніну Барадзе С. Праз некаторы час абсталяваную кватэру вы перадалі пад штаб упаўнаважанаму ДПУ Сазановічу, а самі пераехалі ў камунальны будынак, ня гледзячы на тое, што яго трэба было аддаць пад кватэры міліцыянэрам. Гэтаму самаму Сазановічу, як відаць па дружбе, было выплачана 70 руб. у выглядзе дапамогі з зарплаты мэдыцынскага пэрсаналу.

Кожную хвіліну ўспамінаем вас ня толькі мы, калегі па працы, але і наша славутая інвалідная каапэрацыя, у якой вы па прывычцы і традыцыях дзядоў набралі ў бестэрміновы крэдыт рознай дробязі на 100 руб., у прыватнасьці, некалькі дзесяткаў бутэляк цьвёрдалобай ангельскай «горкай» мышчанскай зуброўкі, а таксама... з чырвонымі галоўкамі.

Мы, дарагі былы старшыня, з прыемнасьцю адзначаем, што вы досыць удала павылучалі жанчын на адказную працу ня толькі ў залатых прамовах 8 сакавіка. Так, напрыклад, па вашаму загаду намесьніцай старшыні спажывецкага таварыства была высунута (ня важна, што пратэставалі несьвядомыя пайшчыкі) ваша законная жонка.

І яшчэ з прыемнасьцю заяўляем мы, што, наогул, у нас большасьць насельніцтва лічыла, што ўлада ў Талочынскім раёне належыла ня толькі вам, але, калі ня ў большай меры, і вашай паважанай палавіне. Напрыклад, нешта раз на прэзыдыуме разглядалася заява вартаўніка райвыканкому аб выдачы яму дапамогі на лячэньне, дык ваша жонка спакойна падсказвала жорстка «адмовіць», што і было зроблена вамі ў тую-ж хвіліну.

Як апошняе, мы напомнім вам, што за пяць месяцаў бюджэтнага году ўсе адміністрацыйна-гаспадарчыя сродкі выдаткаваны. Што зробіць новы склад райвыканкому—невядома, але ўжо другі тыдзень мінае, як пішам мы даведкі на архіўнай паперы і ездзім у сельсавет на сваіх дваіх. Урэшце дазвольце сказаць, што калі Аршанскі акрвыканком ужо прыстроіў вас на работу, дык працягвайце сваю карысную дзейнасьць у такім-жа самым напрамку, бо ня ўсюды такая ціхая сумотная, як у брудным Талочыне: мо' ў Круглым, Дрыбіне, ці Горках напішуць сапраўдны адрас з подпісам народнага судзьдзі і рэвалюцыйнага пракурора.

За маўклівых супрацоўнікаў РВК, камфракцыі і райкому партыі расьпісаўся Цім. Зарэчны.

ВЕЧАР БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ У МАСКВЕ

(Ад нашага маскоўскага карэспандэнта).

Вялікі Чырвонаармейскі Палац — Цэнтральны Дом Чырвонай арміі ў Маскве.

У гэтым доме 21 красавіка адбыўся вялікі вечар беларускай культуры.

Сотні пакояў, лябараторый, выставак... Тут куецца думка сьвядомага ваякі Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі—вартаўніка СССР.

Побач з іншымі выстаўкамі на другім паверсе арганізавана беларуская выстаўка. Беларусы, рабочыя Масквы і чырвонаармейцы, што сабраліся на вечар, шнурам-чарадой праходзяць каля беларускай выстаўкі—знаёмяцца з гаспадарчымі і культурнымі дасягненьнямі Савецкай Беларусі, з гісторыяй рэвалюцыйнага мінулага і тымі напрамкамі, па якіх працоўныя Беларусі ідуць да новага жыцьця сацыялізму.

А 8 гадзіне ўвечары т. Пяцюкевіч адчыняе вечар, прысьвечаны беларускай культуры. У прэзыдыуме—т. т. Чарвякоў, Паўлюкевіч, Пяцюкевіч, Сафонаў, прадстаўнікі рабочых Масквы і прадстаўнікі Чырвонай арміі. У ганаровы прэзыдыум абіраюцца т. т. Чарвякоў, Гамарнік, Васілевіч, Калінін, Варашылаў і Уншліхт.

ДАСЯГНЕНЬНІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ І ГАСПАДАРКІ.

З дакладам аб дасягненьнях беларускай культуры і гаспадаркі выступіў сталы прадстаўнік БССР пры ўрадзе СССР т. Паўлюкевіч.

Працоўныя Савецкай Беларусі шпаркімі крокамі ідуць па шляху сацыялістычнага будаўніцтва, ня гледзячы на ўсе тыя раны, якія нанесла імпэрыялістычная і грамадзянская вайна. Усё зруйнаванае, разбуранае ўпартай настойлівасьцю працоўных аднаўлена.

Кастрычнікавая рэвалюцыя дала магчымасьць працоўным Савецкай Беларусі стаць незалежнымі, дала магчымасьць самастойна пад кіраўніцтвам Камуністычнай Партыі будаваць сваю культуру і гаспадарку. Малая, незаметная Беларусь, якая знаходзілася сярод балот і лясоў, на роўных правах уваходзіць у наш вялікі Савецкі Саюз, пры дапамозе якога працоўныя Савецкай Беларусі зрабілі вялікія посьпехі ва ўсіх галінах будаўніцтва.

У нацыянальным пытаньні Кастрычнікавая рэвалюцыя зрабіла роўнымі ўсе нацыянальнасьці. Раней у Беларусі ня было ніводнай школы, ніводнага тэатру, ні бібліятэкі, ні газэты; цяпер у Савецкай Беларусі ёсьць чатыры ВУЗ'ы, звыш 30 тэхнікумаў, дзесяткі газэт усіх нацыянальнасьцяў, і ўсё гэта зроблена ва якіх-небудзь 7-8 год.

Далей, дакладчык спыняецца на становішчы Заходняе Беларусі і на апошнім працэсе „Беларускай Грамады“.

ПРАМОВА ТАВ. ЧАРВЯКОВА.

— Таварышы! У сучасны момант усё больш узмацняецца ўвага да нацыянальнага пытаньня. Гэта зусім зразумела, бо ўтварэньне Савецкага Саюзу пабудавана на аб'яднаньні ўсіх нацыянальнасьцяў, што зьяўляецца ва ўсім сьвеце нябывалай нацыянальнай палітыкай, якую праводзіць наша Камуністычная Партыя.

Гісторыі было патрэбна падзяліць Беларусь на дзьве часткі: адна частка яе знаходзіцца ў СССР, а другая —у суседніх буржуазных краінах. Маючы такое становішча, мы можам бачыць, які ўплыў робяць на разьвіцьцё краіны савецкі і капіталістычны лад. Савецкая Беларусь адрадзілася да новага жыцьця шляхам шпаркага разьвіцьця сваёй нацыянальнай культуры і гаспадаркі; з кожным годам паляпшаецца матар'яльнае становішча працоўных мас, расьце і ўзмацняецца наша сацыялістычнае будаўніцтва. Усе гэтыя вынікі працы і вялікія дасягненьні Савецкай Беларусі кідаюцца ў вочы ўсім працоўным капіталістычных краін, а асабліва—Зах. Беларусі.

Далей т. Чарвякоў спыняецца на працэсе «Беларускай Грамады» і на тым становішчы, у якім прыходзіцца жыць і змагацца працоўным Зах. Беларусі.

— Калі БССР,—кажа т. Чарвякоў, —з кожным днём мае ўсё новыя і новыя дасягненьні ў гаспадарцы і культуры, дык там, у Зах. Беларусі, мы бачым нябывалы ўціск; там асобныя нацменшасьці прымушаны шукаць прытулку ў іншых краінах. У выніку гэтага, як мы ведаем, працоўныя Зах. Беларусі ў сучасны момант ясна ўяўляюць сабе, што толькі пры савецкім ладзе прыдзе вызваленьне іх ад уціску капіталу, і што для гэтага трэба ісьці па прыкладзе Савецкай Беларусі.

Нацыянальная палітыка, якая праводзіцца ў адносінах да Савецкай Беларусі, робіць вялікі ўплыў на Зах. Беларусь і на ўсе сумежныя буржуазныя краіны. І нямецкі карэспандэнт, які прыяжджаў у БССР, быў прымушан адзначыць вялікія дасягненьні Савецкай Беларусі.

* * *

Пасьля ўрачыстай часткі сіламі беларускага клюбу ў Маскве і артыстамі Беларускага Дзяржаўнага тэатру быў наладжан вялікі канцэрт. Хор беларускага клюбу выканаў шэраг сьпеваў. Сімфанічны канцэрт маскоўскага радыё-вузла выканаў беларускія мэлёдыі.

Я. Зборжынскі.

У Саюзе ССР.

Спаборніцтва між Сярэдня-Волскаю вобласьцю і Ніжня-Волскім краем.

САРАТАЎ. 23-га красавіка падпісан угавор аб сацыялістычным спаборніцтве між Сярэдня-Волскаю вобласьцю і Ніжня-Волскім краем. Аб падпісаньні ўгавору паведамлена Наркому Земляробства т. Кубяку з просьбаю вылучыць прадстаўніка для кіраўніцтва міжабласным камітэтам па спаборніцтву.

Згодна ўгавору Сярэдня-Волская вобласьць абавязуецца пашырыць засеўны абшар на 12 з паловаю процантаў проці леташняга. Ніжня-Волскі край абавязуецца пашырыць засеўны абшар на 13 проц. Вобласьць дае абавязацельства павялічыць ураджайнасьць ня менш, як на 5 процантаў, край—ня менш як на 4 проц., а па калгасах і саўгасах, як вобласьць, так і край абавязаны павялічыць ураджайнасьць на 10 проц. Вобласьць бярэцца заснаваць 20 буйных калгасаў на абшары ня менш 100 тысяч гэктараў, край—27 буйных калгасаў на абшары ў 120 тысяч гэктараў.

У зьвязку з спаборніцтвам Ніжня-Волскі крайком выпушчае спэцыяльную адозву да насельніцтва краю. Бюро крайкому УсеЛКСМ бярэ ўдзел у спаборніцтве між Сярэдняю і Ніжняю Волгаю і пасылае вызаў Сярэдня-Волскаму камітэту УсеЛКСМ.

Спаборніцтвы даюць вынікі.

МАСКВА, 25-4. Сацыялістычнае спаборніцтва дае ўжо вынікі. На папяровай фабрыцы «Красный Курсант» у Вятцы за першыя дні міжцэхавага спаборніцтва выпрацоўка павялічылася з 7847 кілёграм за дзень да 11142 кілёграм. Значна зьменшыліся прастоі і брак. На Кісьленскіх капальнях на Далёкім Усходзе ў выніку спаборніцтва здобыч вугалю ўзрос з 436-ці тон да 572-х тон за дзень. За першую дзесяціднёўку красавіка зусім ня было прагулаў.

Выезд усходня-прускае дэлегацыі ў Нямеччыну.

МАСКВА, 23-4. У Маскву вярнулася з падарожжа па поўдні СССР усходня-пруская дэлегацыя на чале з обэрпрэзыдэнтам Усходняе Прусіі Зір. Зір, наводзячы вынікі пабыту дэлегацыі ў СССР, заявіў так: «Уся дэлегацыя выказвае надзвычайнае здаволеньне сваім пабытам у СССР. Усюды, дзе дэлегацыя пабывала, яна атрымала шмат цікавых уражаньняў. Вялізэзныя праблемы, якія ставіць перад сабою Савецкі Саюз—індустрыялізацыя краіны і перабудова сельскае гаспадаркі—усюды ажыцьцяўляюцца з вялікім напружаньнем сіл. І трэба прызнаць, што ў некаторых галінах ужо дасягнуты заслугоўваючыя ўвагі вынікі. Перамовы, якія праводзіла дэлегацыя з афіцыйнымі ўстановамі, усюды адбываліся ў спрыяючых варунках і былі прасякнуты духам узаемнага давер'я і разуменьня. Гэта дае магчымасьць выказаць упэўненасьць, што наладжаныя добрыя дачыненьні між Усходняй Прусіяй і СССР ня толькі ня спыняцца, але і набудуць далейшае паглыбленьне і разьвіцьцё».

Дэлегацыя ў поўным складзе выехала назад у Кенігсбэрг.

Савгас у паўміліёна гэктараў.

КЗЫЛ-АРДА, 23-4. „Распачалася валявая праца ў самай буйнай савецкай гаспадарцы Саюзу—Чагілінскім. Савгас засноўваецца на абшары ў паўміліёна гэктараў (у адным масыве). У савгасе працуе ўжо 120 трактараў. Сёлета засяваецца пакуль што 10 тысяч гэктараў. Курсы трактарыстаў далі 250 рулявых. У савгасе распачалася будаўнічая праца.

Рабочыя вынаходцы на Днепрастане.

ХАРКАЎ, 25-4. Сабраны вельмі цікавыя весткі аб рабочым вынаходстве на Днепрастане, аб новых Эдысонах, якія выходзяць з пралетарскага асяродку. На Днепрастане праз увесь час плацілі 12 залатых рублёў за кожную амэрыканскую муфту для пэрфаратарнага малатка. Амэрыканскія муфты псаваліся праз кожных 12 гадзін працы. Рабочы Днепрастану тав. Літвіненка прапанаваў зрабіць муфту ня з сталі і медзі, а са звычайнага цэмантаванага жалеза. Такая муфта была зроблена і працуе ўжо 8 месяцаў і да гэтага часу няма і знаку, што яна псуецца. Літвіненка ўдасканаліў таксама і штурхачы для прафаратару. Вынаходка Літвіненкі дасьць эканомію Днепрабуду ў 600 рублёў штодня. Кранавы машыніст Мартынаў вынайшоў прыладу, якая пазбаўляе ад магчымасьці абарачваццa загранічнаму лёкамабільнаму крану пры вялікай нагрузцы. Да гэтага часу ў гэтай галіне было шмат аварый. Рабочы Няфедаў вынайшоў варстат для выпрацоўкі гаяк. Раней такія гайкі рабіліся ручным спосабам і за іх плацілі залатою валютаю. Вынаходка дала за паўтары месяцы 6 тысяч рублёў эканоміі.

Новыя залежы меднае руды.

ЛЕНІНГРАД, 23-4. У Казакстане—на паўночны захад ад возера Балхаш—геалёгічная разьведчая партыя выкрыла залежы меднае руды ў трох урочышчах —Коўнрад, Карабай і Сакуркай. У адным толькі ўрочышчы Коўнрад залежы займаюць абшар у 250 тысяч квадратных мэтраў.

Водлуг папярэдніх падлікаў, у гэтай частцы залежаў агульны запас руды дасягае 25-ці міліёнаў тон.

Павялічэньне вырабу с-г. машын.

РАСТОЎ Н-Д. 19-4. Распачаўся будаўнічы сэзон на Сельмашбудаўніцтве. У бягучым сэзоне ў будаўніцтве будуць знаходзіцца 50 асобных будынкаў. Кошт усіх будаўнічых работ гэтага сэзону разам з абсталяваньнем іх вылічваецца ў 15 міліёнаў рублёў. У чэрвені завод пачне выпуск сялянскіх ходаў, у сувязі з чым зараз сьпешна рамантуюцца адпаведныя цэхі. Устаноўка часткі абсталяваньня дала магчымасьць правесьці зборку першае партыі сялянскіх ходаў, якія па агульнаму водзыву перавышаюць якасьцю існуючыя на рынку сялянскія ходы.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

АДЧЫНІЎСЯ III АКРУГОВЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ МАЗЫРШЧЫНЫ.

(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

24 красавіка адчыніўся III акруговы зьезд саветаў Мазыршчыны. На зьезд прыбыло каля 200 дэлегатаў. Зьездам паслана прывітальная тэлеграма XVI партканфэрэнцыі, ЦК УсеКП(б), ЦВК БССР і СНКБ.

Зьезд віталі прадстаўнікі Акругкому партыі і прафсаюзаў. У ганаровы прэзыдыум абраны члены Палітбюро ЦК УсеКП(б), тав. Гамарнік, Чарвякоў і Галадзед, пасьля чаго зьезд прыступіў да сваёй працы. Зьезд заслухаў справаздачу ўраду. Са справаздачай выступіў тав. Бэнэк.

Саф'ян.

Падрыхтоўка да 1 мая.

БАБРУЙСК, 25-4. Ужо цяпер па клюбах і саюзах праводзяцца гутаркі аб значэньні першага мая для працоўных Савецкага Саюзу. Падрыхтоўка цесна ўвязваецца з антырэлігійнаю работаю. Бібліятэкі клюбаў рыхтуюць спэцыяльныя бібліятэчкі да сьвята. Гурткі рыхтуюць з свайго боку мастацкае афармленьне сьвяткаваньня.

Апрача ўрачыстасьцяў, якія будуць праведзены ў дні майскага сьвята (вечары, дэманстрацыі і г. д.), мяркуецца адзначыць гэтае сьвята выпускам школ па ліквідацыі няпісьменнасьці, ваенных гурткоў, гурткоў санітарных. Да гэтага часу рыхтуецца адчыненьне дзіцячых садоў і пляцовак як у горадзе, так і ў вёсцы.

У дзень 1 мая ў горадзе адбудзецца адчыненьне гарадзкога саду «Прафінтэрн».

Перад першым мая на вуліцах наладжана будзе дэманстрацыя кінофільмаў. Тэатры і кіно ў дні сьвята наладжваюць агульнадаступныя спэктаклі.

2 мая бабруйскі камсамол арганізоўвае масавы паход у вёску пад лёзунгам шырокай арганізацыі дапамогі вясковай беднаце ў правядзеньні сяўбы. Гэты паход зьвіцца працягам камсамольскага паходу за ўраджай, які ва ўмовах Бабруйшчыны мае свае вялікія станоўчыя вынікі.

Па выніках папярэдняй падрыхтоўкі да сьвята можна сказаць, што сьвяткаваньне 1 мая на Бабруйшчыне выльлецца ў масавае культурнае сьвята і адначасова ў дэманстрацыю супроць рэлігіі і рэлігійных забабонаў.

А. Дамброўскі.

Расьсьледваньне справы забойства селькора Івановіча.

(Ад нашага спэц. карэспандэнта).

Зьверскае забойства вясковага актывіста вёскі Бардзілаўкі, Самахвалавіцкага раёну, Івановіча, якое адбылося ўначы з 12 на 13 красавіка ў вёсцы Патроўшчыны, дзе Івановіч знаходзіўся на курсах сельска-гаспадарчага актыву, не прыцягнула да сябе належнай увагі з боку мясцовых, партыйных і савецкіх органаў. Райміліцыя, нікога не паведаміўшы аб факце забойства, сама ўзялася за вядзеньне справы без належнай чуласьці, чым затрымала ход расьсьледаваньня справы.

Камісія, якая выехала 23 красавіка з Менску, на месцы мабілізавала ўсе сродкі для выяўленьня прычыны забойства. Па справе затрыманы 4 асобы, якія западозраны ў забойстве. З прыездам камісіі ўзмоцнена сьледзтва і знойдзены некаторыя рэчы забітага, якія былі забраны забойцамі. Сьледзтва ў поўным разгары. Акрамя гэтай справы, камісія занялася высьвятленьнем стану рабселькораўскага руху ў раёне і кіраваньня з боку мясцовых партарганізацый.

Я. Ч.

Згінуў селькор Бужынскі.

ПОЛАЦАК, 22-4. 15 красавіка невядома куды згінуў старшыня камуны «Маяку» (Дрысенскі раён), член партыі, ён-жа актыўны селькор «Беднаты», «Чырвонай Полаччыны» і інш. газэт, тав. Бужынскі, які за апошні час змагаўся за ўзмацненьне камуны, вёў рашучую барацьбу з рознымі злачынствамі, карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод сялянства і праводзіў шырокую грамадзкую працу. Ёсьць дапушчэньне, што селькора Бужынскага забілі, бо яму раней яшчэ пагражалі забойствам.

Для падрабязнага высьвятленьня і прыняцьця належных мер у камуну выехала з Полацку спэцыяльная камісія.

Пачалося перасяленьне.

Ворша, 22-4. У гэтым годзе Аршанскай акрузе для перасяленьня сялян дана 10.000 душавых месцаў у Сібіры, 2675—на Далёкім Усходзе і 1800 на Урале. Увесь гэты фонд разьмеркаваны ўжо па раёнах і апошнім дадзена заданьне сачыць за тым, каб перасяленьне пайшло пераважна за кошт калектываў і наогул каапэрацыйных арганізацый. У гэтым годзе падбор перасяленцаў павінен быць не выпадковы, да кожнага трэба прыглядацца і даваць магчымасьць перасяляцца толькі тады, калі ў гэтым ёсьць патрэба і калі бяз гэтага ня можна будзе абыйсьціся. Таксама ў гэтым годзе будзе значна ўзмоцнена назіраньне за тым, каб перасяленцы здавалі сваю зямлю ў арэнду пераважна беднаце і сераднякам. Перадача зямлі ў арэнду заможным і кулакам дапушчацца ня будзе. Райвыканкомам дадзена заданьне ўвесь фонд па перасяленьню скарыстаць поўнасьцю. Калі ён будзе заставацца, перадаваць тым раёнам, дзе ён будзе патрэбен.

А. Мілашэўскі.

Новы халадзільнік у Магілеве.

Магілёўскі акруговы выканком ухваліў праэкт пабудовы ў Магілеве халадзільніка па лініі Наркамгандлю.

УМЯШЧАЛЬНАСЬЦЬ ХАЛАДЗІЛЬНІКА АРЫЕНТЫРОВАЧНА ВЫЛІЧАНА ДЛЯ ПЕРШАЙ ЧАРГІ НА 600 КУБ. САЖ. (НА ЗАХАВАНЬНЕ 75 ТЫС. ПУД. РОЗНЫХ ПРАДУКТАЎ), КОШТ ПАБУДОВЫ—КАЛЯ 600 ТЫС. РУБЛЁЎ.

Халадзільнік праэктуецца пераважна для забесьпячэньня прадуктаў гораду, якія доўга трымаць нельга, а таксама для захаваньня прадуктаў, якія вывозяцца за межы акругі. Тэрмін працы халадзільніка разьлічан на 25 год, да канца якіх насельніцтва гораду павялічыцца да 100.000 чалавек.

На захаваньні будзе знаходзіцца 25 тысяч пудоў мяса (гэтая колькасьць паступова будзе павялічана да 50 тыс. пуд.), 10-20 тыс. пуд. сала, 7-12 тыс. пудоў масла сьметанковага, а таксама —сыры, алей расьлінны, рыба, фрукты, гародніна, мёд, яйкі.

Мэтазгоднасьць пабудовы халадзільніка менавіта ў Магілеве абгрунтоўваецца наліччам бойні, якая як па тэхнічным абсталяваньні, гэтак і з санітарнага боку зьяўляецца аднэй з лепшых у Беларусі (агульная каштоўнасьць бойні—335 тыс. руб., без дапаможных і жыльлёвых будынкаў). Каля гэтае бойні і праэктуецца пабудаваць халадзільнік, які АД СТАНЦЫІ ЛУПАЛАВА будзе ў аддаленасьці ўсяго каля 2 кілёмэтраў (для непасрэднай падачы вагонаў да халадзільніка трэба будзе пракласьці чыгуначную ветку), ад Магілеву—3 з пал. кілём., ад прыстані на Дняпры—3 кілём. і ля самага стыку дзьвух шасэйных шляхоў.

Н.

САМАКРЫТЫКА—ПРАВЕРКА—КАНТРОЛЬ МАС

Самакрытыка дапаможа ачысьціць апарат ад гнілі.

Неадкладная задача.

Набліжаецца чыстка савецкага апарату. У падрыхтоўчую працу да чысткі ўцягнуты шматтысячныя масы працоўных, якія ўжо выказалі свой погляд у сваіх рэзалюцыях па гэтым пытаньні.

Аб чым гавораць гэтыя пастановы? Яны яшчэ раз сьведчаць аб тым, што пытаньне чысткі савецкага апарату зьяўляецца неабходным і неадкладным мерапрыёмствам, асабліва ў сучасных умовах сацыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, праца па чыстцы савецкага апарату ад варожых, бюракратычных, нягодных элемэнтаў дасьць тых вынікаў, якіх мы калі ня зьвяжам чысткі з высоўваньнем у апарат новых кадраў працаўнікоў, якія вырасьлі на заводах і фабрыках і на нізавой савецкай працы. Чыстка праводзіцца дзеля аздараўленьня дзяржаўнага апарату, палепшаньня яго працы і прыстасаваньня яго да найлепшага абслугоўваньня працоўных мас; вось чаму пытаньне арабочаньня апарату, вылучэньня ў апарат кадраў працаўнікоў з рабочых і працоўнага сялянства набывае ў сучасны момант актуальнае значэньне.

Як-жа абстаіць справа з пытаньнем падрыхтоўкі кадраў, высоўваньне працаўнікоў з рабочых і працоўных сялянскіх мас для замены вычышчаных? Нажаль, трэба сьцьвердзіць, што гэтаму пытаньню вельмі мала аддаецца ўвагі. Сур'ёзна, падзелавому ні адзін саюз гэтым пытаньнем не займаўся, за выключэньнем саюзу савецка-гандлёвых служачых, а між тым гэта непасрэдная іх задача, якую неабходна ў бліжэйшы пэрыяд вырашыць.

Саюз савецка-гандлёвых служачых імкнуўся арганізаваць цэлы шэраг курсаў для падрыхтоўкі працаўнікоў, зьвяртаўся да вытворчых саюзаў, каб яны вылучылі рабочых на курсы, і ні адзін саюз не патурбаваўся зрабіць што-небудзь у гэтым напрамку.

Пытаньне з вылучэнствам наогул абстаіць дрэнна: адсутнічае зацікаўленасьць гэтым пытаньнем з боку прафсаюзных органаў, вылучэнства носіць недастаткова грамадзкі характар, слаба пастаўлена дапамога вылучэнцам у справе ўзьняцьця іх тэарэтычнай і практычнай кваліфікацыі.

Каб чыстка савецкага апарату сапраўды дала належныя вынікі, асабліва ў справе ўзьняцьця працаздольнасьці яго і правільнага праводзеньня клясавай лініі ў працы, трэба тэрмінова ўзяцца за працу па адборы і падрыхтоўцы вылучэнцаў. Трэба арганізаваць зараз-жа шэраг курсаў для вылучэнцаў, маючы на ўвазе характар іх будучай працы ў той ці іншай установе.

Поруч з вылучэнствам у гарадох неабходна адначасова заняцца пытаньнем вылучэнства і ў вёсцы ў нізавы дзяржаўны апарат. Сярод бядняцка-серадняцкага актыву шмат знойдзецца добрых працаўнікоў, якія з посьпехам змогуць працаваць у нашых установах.

Вылучэнства і падрыхтоўка працаўнікоў у дзяржаўны апарат з рабочых і працоўных сялянскіх мас неадкладная задача. Гэту задачу трэба вырашыць як найхутчэй. **М.**

Чужыя людзі ў загатоўчым апараце.

(Самахвалавічы, Менскай акругі).

З восені, калі распачалася загатоўчая кампанія, нашы каапэратары доўга думалі аб тым, як паставіць на належную вышыню мясазагатоўкі. Дзеля гэтага як адно, так і другое таварыства запрасілі на працу мясазагатоўцаў. Загатоўчая праца разгарнулася. У крэдытным т-ве жывёла набывалася цэлымі гуртамі па 100 і больш штук. Але-ж справа мясазагатовак у абодвых таварыствах была пастаўлена так, што ніхто цяпер ня ведае, колькі было куплена жывёлы, які прыбытак далі мясазагатоўкі, і ці ўвесь прадукт здаваўся ў дзяржаўныя і каапэрацыйныя ўстановы. Адно толькі вядома, што ў крэдытным т-ве зварот на мясазагатоўках дасягнуў 50000 руб.

Рэвізійная камісія спажывецкага т-ва доўга білася, пакуль зрабіла падрахунак. Выявілася, што мясазагатоўкі далі прыбытку больш 900 р., але адначасова растрачана загатоўшчыкамі 654 р., рэвізійная камісія ў акце вынесла заключэньне, што загатоўшчыкаў трэба зара-жа зьняць з працы і аддаць пад суд, ня гледзячы на гэта, апошні працуюць і па сёньнешні дзень.

Трэба адзначыць, што мясазагатоўцы,—былыя спэкулянты і пазбаўлены выбарных правоў.

Так нашы каапэратары далі прытулак спэкулянтам, якія атрымоўваюць па 150 р. у месяц, гандлююць, як ім захочацца, і нажываюцца на гэтай справе, растрачваючы грамадзкія грошы.

Трэба хутчэй іх вычысьціць з нашых каапэрацыйных устаноў. **Шыпоўнік.**

Як Зіначка ашукала Наркамасьветы.

Зіначка, дачка буйнага дамаўласьніка-нэпмана Левіна пачынае сваю навуку з гімназіі Левіцкай, затым вучыцца ў гімназіі Рэймана, а па сканчэньні агульна-адукацыйных курсаў трапляе... у... Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт. Дарма, што пазбаўлена ў правох Зіначка. Гэта не перашкаджае ёй трапіць на пэдфак і вучыцца на сацыяльна-гістарычным аддзяленьні тры гады.

Ужо на першым курсе Зіначка заяўляе:

— Ох, як цяжка вучыцца ў хамскім унівэрсытэце! —і робіць захады перавесьціся ў Ленінград...

А маці яе, раскормленая нэпманка Левіна, кажа суседзям:

— О, мая Зіначка! Мая Зіначка будзе добраю жонкаю доктару. Не, яна настаўніцай ніколі ня будзе, а вышэйшую асьвету—чаму не атрымаць, калі плаціць прыходзіцца ўсяго сто пяцьдзесят рублёў...

І Зіначка вучыцца.

Праўда, яна ў Унівэрсытэце зьвязваецца з сіёністам Капеліовічам і займаецца распаўсюджаньнем сіёнісцкай літаратуры сярод студэнцтва. У хаце яна чытае сіёнісцкія часопісі, а ў унівэрсытэце на сэмінарыях яўрэйскай культуры ў асыстэнта Сосіса абурана выказвае сіёнісцкія погляды:

— Чаму у савецкай дзяржаве няма для яўрэяў аўтаномнай рэспублікі?.. Чаму мы не вывучаем гісторыі яўрэйскага народу?..

І Зіначка, пераходзячы з курсу на курс, вучыцца, „рыхтуецца“ атрымаць атэстат аб сканчэньні БДУ і права на выкладаньне грамадазнаўства ў савецкай працоўнай школе.

Увесь час Зіначка цураецца «хамаў». Яна з імі ня хоча нават гаварыць. Грамадзкая праца студэнцтва для яе не абавязкова. Іншая справа мяшчанскую вечарынку у сваёй хаце наладзіць—на гэта Зіначка заўсёды гатова. На вечарынках адбываецца і «апрацоўка».

Чыстка Белдзяржунівэрсытэту ад варожа-клясавых элемэнтаў застае студэнтку Зінаچку Левіну на трэцім курсе. Пачуўшы пра чыстку, жадаючы стаць поўнапраўнай, яна раптоўна просіць грамадзкай работы. Але трапляе Зіначка пад пралетарскі венік чысткі і выключаецца з Унівэрсытэту, як клясава-чужы элемэнт, якому нельга ў будучыні даручыць выкладаньне такой важнай дысцыпліны, як грамадазнаўства ў яўрэйскай працоўнай школе.

Зіначка зьнікае з Унівэрсытэту. Настрой пралетарскага студэнцтва аднадумны. — Добра, што вымятаюць усялякую твань з нашых радоў!

— Няма Зіначкі!..– жартуюць хлопцы.

Аднак, раптоўна Зіначка зноў паказваецца ў Унівэрсытэце:

— «Меня Наркомирос восстановил»!—з пагардай заяўляе студэнцтву і працягвае навучаньне.

Студэнцтва абурана. Зноў пачынаюцца гутаркі пра Зіначку і ў дадатак пра... Наркамасьветы.

— Вось як упарта лезе нэпман у пралетарскія шэрагі...

— У Наркамасьветы сядзяць прымірэнцы—яны замазваюць клясавую сутнасьць нашай барацьбы, нашага пралетарскага Унівэрсытэту...

Аказваецца, што НКА тут вінават мала. Зіначка ашукала НКА, затаіўшы, што яна студэнтка сацыяльна-гістарычнага аддзяленьня, а напісаўшы ў заяве, што яна студэнтка прыродазнаўчага...

... А якая ў прыродзе клясавая барацьба... Гэта ня тое, што ў гісторыі клясавай барацьбы чалавецтва...

На аснове гэтага Зіначка Левіна атрымлівае ад НКА паперку ў БДУ з прапановай... аднавіць.

І Зіначка сапраўды аднаўляецца.

На гэтым, бязумоўна, гісторыя з ашуканствам НКА—ня скончана.

Студэнты горача пратэстуюць. І мы ўпэўнены, што НКА адменіць сваю пастанову пра Зіначку.

Такім, як Зіначка, ня месца ў Унівэрсытэце.

Такім, як Зіначка, мы ня можам даручаць выхаваньне моладзі. **АКША**

Там, дзе заселі бюракраты.

(Гомельскі акруговы суд).

У апошні час вельмі шырока абгавараецца пытаньне аб узьняцьці ўраджайнасьці. Адначасова пастаўлена пытаньне аб барацьбе са шкоднікамі, перашкаджаючымі селяніну ўзьнімаць сваю гаспадарку (злачынцы, зладзеі, кулакі і г. д.).

Усе гэтыя мерапрыёмствы «не датычацца» гомельскага акруговага суду.

У Веткаўскім раёне,Гомельскай акругі ў вёсках ёсьць група злачынцаў, зладзеяў, хуліганаў, якая сыстэматычна тэрарызуе насельніцтва навакольных вёсак. Гэта браты Матэўшавы Карп і Саўка, браты Магонавы Янка, Рыгор, і Сяргей і нейкі Старушкоў. Усе яны перабывалі ў міліцыі і пад судом ад 2-х да 5-ці разоў.

Пракурор, улічваючы іх сацыяльную небясьпеку і шчыльную сувязь з злачынцамі, перадае іх суду па 39 арт. Крым. Код. (высяленьне). Справа слухаецца ў грамадзкім парадку пры перапоўненай аўдыторыі сялянствам. Іх высяляюць на 5 год кожнага за межы Гомельскай акругі.

Сялянства ўсьцешылася, але не надоўга. Праз тыдзень акруговы суд у крымінальна - касацыйным аддзяленьні з-пад арышту іх вызваліў, паслаўшы нарсуду вельмі філёзофскую пастанову. Зладзеі хуліганы Матэўшавы і Магонавы зноў пачалі чыніць свае беспакаранныя справы. І праз тыдні два зноў гэта група нападае на „лаўку“ падсудных за цяжкае параненьне селяніна (150 арт. Крым. Код.).

Нарсуд зноў прызнае іх знаходжаньне ў Веткаўскім раёне сацыяльна-небясьпечным і зноў пасьля належных тэрмінаў турмы дае ім высылку на 3 гады кожнаму.

Здавалася-б, тут уся справа скончана. Але зноў судзейскія чыноўнікі акруговага суду вызваляюць іх і даюць замест турмы і высылкі прымусовыя работы. А дзе-ж голас сялянства? Дзе кіпа папераў, заяў сялян у Веткаўскую райміліцыю? Гэтага яны ня чуюць і ня бачаць.

Яшчэ некалькі характэрных фактаў. У м. Сьвяцілавічах жыве прафэсыянал злачынца Прывалаў Аляксей. Яму с-г. таварыства дае на набыцьцё каня 85 руб.; ён за гэтыя грошы едзе на Каўказ, прапіў іх, прагуляў і прыехаў назад красьці, хуліганіць. Агульны сход сялян склаў хадайніцтва за 53 подпісамі аб яго высяленьні. Нарсуд яго высяляе на год. Матар'ял добры, але не для акр. суду—яго вызваляюць.

Гольдман Іцка —вядомы афэрыст, злодзей, канакрад, не адзін раз судзіўся. Ён купляў у сялян-беднякоў адпушчаны ім лясьніцтвам па льготных цэнах лес бяз права перапродажу. Сыстэматычна ашуквае сялян. Нарсуд яго судзіць па 135 арт. Крым. Код. (гандаль лесам) па справе 20 пацярпеўшых ашуканых сялян. Справа слухаецца 2 дні ў грамадзкім парадку ў клюбе. Акруговы суд нічога гэтага не прызнае: «Прыгавор нарсуда адмяніць і вядзеньне справы спыніць». Вось пастанова судзьдзі Гомельскага акрсуду. Яны ня чуюць бурнага пратэсту сялянства. Яны заселі за тоўстымі законамі і вялікімі папкамі паперы. Ці не хварэюць яны скрыўленьнем клясавае лініі? **Рэзьнікаў Х.**

Растратчыкаў—пад суд.

(Калінкавіцкі р., Мазыршчына).

Два гады заядалі Дудзіцкую каапэрацыю растраты, якія дасягалі 2000 руб. Але вось у 1927-28 г. каапэрацыя трохі падлячылася. Растраты зьнікалі, гадоў паўтара каапэрацыя расла.

Але вось летам 28 г. здарылася растрата ў крамніцы Хасі Голад у 360 руб. Старшыня праўленьня Казлоў і рахункавод Слуцкі пакрылі гэту растрату: 60 р. сьпісалі, а 200 р. заклалі сваімі грашмі. А дзе яны іх узялі? Вядома, укралі ў каапэрацыі. Сьледзтвам устаноўлена, што пакрыцьцё растраты адбылося з-за інтымных адносін старшыні Казлова і рахункавода Слуцкага з крамніцаю.

Неабходна прыцягнуць да адказнасьці Казлова, Слуцкага, а разам з імі Дронікэ, старшыню рэвізійнай камісіі са згоды якога была пакрыта растрата. Зараз пры рэвізіі на 4-х крамах зноў выяўлена на 400 руб. растрат. Трэба хваробу лячыць. **Сяргейчык.**

Рыхтуемся да чысткі савецкага апарату

(г. Мсьціслаў).

Мсьціслаў распачаў падрыхтоўку да чысткі савецкага апарату. Быў скліканы сход прафактыву, які заслухаў інфармацыйны даклад упаўнаважанага РСІ аб чыстцы і мэтадах яе праводзеньня. Ва ўмовах Мсьціслаўля назіраюцца моманты бюракратызму, валакіты, скрыўленьня клясавай лініі, што зьяўляецца прадуктам засьмечанасьці савецкага апарату, а таму тут чыстка вельмі патрэбна.

У спрэчках па дакладу выказалася каля дзесяці таварышоў, якія адзначалі неабходнасьць добрай падрыхтоўкі да гэтай працы, каб пазбавіцца магчымых памылак. Адзін з прысутных заўважыў зьмену з боку некаторых служачых у адносінах да наведвальнікаў: служачыя зрабіліся вельмі ўважлівымі да апошніх. Гаварылі некаторыя аб тым, што было-б добра арганізаваць невялікія групы з рабочых, жанчын і накіраваць іх па ўстановах для праверкі працы.

Вынесена прапанова РПБ аб наладжаньні курсаў для вылучэнцаў. **Скор**

ГУРЭВІЧ—ЗА ПРЫВАТНІКА.

Упаўнаважаны Зеляноцкага лясьніцтва па лесу загатовак Гурэвіч падпісаў умову з беднякамі в. Убалоці на вываз лесу на прыстань. Калі дарога была кепская, дык беднякі вазілі лес, а як дарога папраўлілася, упаўнаважаны наняў заможнікаў з другой вёскі вазіць гэты самы матар'ял, нягледзячы на тое, што падпісаў умову, а калі адзін з беднякоў Максімаў пашоў пытаць упаўнаважанага, чаму ён нанімае вазіць лес заможнікаў, дык упаўнаважаны прагнаў яго з хаты.

ЦІ ПАТРЭБЕН ГЭТКІ.

У Юравіцкім РВК, Мазырскай акр. на пасадзе скарбніка фінчасткі працуе Сабатароў. Калі да Сабатарова зварочваюцца сяляне па якой-небудзь справе, ён адказвае: «Прыдзеш яшчэ 5 раз—няма грошай у касе» і г. д. Затое ён любіць у часы працы кідаць яе і рабіць прыемныя прагулы.

Юравіцкі РВК павінен падумаць аб шкоднасьці такога працаўніка. **М.**

ВЫГНАЦЬ ШКОДНІКА.

Дачка кулака Вечар скончыла пэдфак БДУ і была накіравана на працу ў Пухавіцкую сямігодку. Вынікі працы Вечар аказаліся «вельмі добрымі». Разьмеркаваньне вучняў на «праваслаўных і іудзеяў», складаньне заможнай групы, забарона гаварыць на-яўрэйску,—усё гэта было зроблена хутка.

Аб дзейнасьці Вечар быў допіс у газэце „Чырвоная Зьмена“. Камісія, якая расьсьледвала справу, усё гэта пацьвердзіла, але на гэтым і застанавілася. Замест таго, каб гэткі шкодны элемэнт выгнаць з савецкай школы, Вечар перавялі ў Навасёлкаўскую сямёхгодку.

Наркамасьветы! Радзім вычысьціць гэты нарост з школы. **А. С.**

„Налёт“ РСІ і „лёгкай кавалерыі“ на менскія лекавыя ўстановы

АБСЬЛЕДАВАНА 12 УСТАНОЎ.—СПАЗЬНЕНЬНІ НА ПРАЦУ—АМАЛЬ АГУЛЬНАЕ ЗЬЯВІШЧА.—УСЮДЫ ЎВАЖЛІВЫЯ АДНОСІНЫ ДА ХВОРЫХ.

24 красавіка бюро скаргаў НК РСІ БССР арганізавала «налёт» «лёгкіх кавалерыстаў» у менскія ўстановы аховы здароўя.

19 чалавек «кавалерыстаў»—студэнтаў рабфаку і курсаў мэдыцынскіх сясьцёр пры «Чырвоным Крыжы» з самай раніцы ў якасьці звычайных наведвальнікаў-хворых накіраваліся па розных лекавых установах, а ўвечары ў сваім штабе—бюро скаргаў—дзяліліся сваімі назіраньнямі і ўражаньнямі і вынікамі «налёту».

„Налёт“ ставіў сваёй мэтай праверыць: сваечасовасьць прыёму хворых, адносіны да наведвальнікаў з боку пэрсаналу, у якіх умовах прыходзіцца чакаць прыёму хворым, і як стаіць справа з кнігамі скаргаў.

«Лёгкая кавалерыя» абсьледавала 12 устаноў ва ўсіх канцох Менску.

Аб чым-жа апавядалі „налётчыкі?“

Вельмі прыемна адзначыць, што, за рэдкімі выключэньнямі, адносіны тэхнічнага і мэдыцынскага пэрсаналу добрыя і ветлівыя. Дактары ўважліва дасьледуюць хворых; быў толькі адзін выпадак, калі ў менскай цэнтральнай рабочай амбуляторыі і доктар Хургіна, спазьніўшыся на паўтары гадзіны, за 50 хвілін прыняла 14 чалавек.

Спазьненьне на працу на 15-20 хвілін—амаль што агульнае зьявішча. Нават у прывакзальнай амбуляторыі галоўны доктар сказаў абсьледавацелю: —«гэта яшчэ нічога, а год таму назад дактары пазьніліся на паўгадзіны, а то і на цэлую гадзіну».

Праўда, на вячэрнім прыёме ў гэтай амбуляторыі спазьненьняў ужо ня было. Наогул-жа вялікім «аматарам» спазьненьняў у прывакзальнай амбуляторыі зьяўляецца доктар Балкавец.

У Ляхаўскай раённай амбуляторыі мэдыцынскі пэрсанал прыходзіць сваечасова, але і тут ня ўсё добра: зубны доктар Левіна сыстэматычна позьніцца на 15-30 хвілін, не адстае і вячэрняя рэгістратарша. Аб іх спазьненьнях пісалі і ў кнізе скаргаў, але не дапамагае.

У цэнтральнай рабочай амбуляторыі ўсе, за выключэньнем Хургінай, прышлі роўна а 9-й гадзіне; сваечасова пачынаецца і прыём хворых, але ёсьць недарэчнасьці ў рэгістратуры. Рэгістратар нумары на прыём дае не па чарзе, а больш на вока. Так, першаму абсьледавацелю даў № 11, а другому праз паўгадзіны № 9. Наведвальнікі гэтай амбуляторыі скардзяцца, што рэгістратары сваім „любімчыкам“, а можа і знаёмым даюць маленькія нумары чаргі, а рабочыя шмат часу трацяць на стаяньне ў чарзе.

У амбуляторыі на Пярэсьпе няма спазьненьняў; не заўважана і іншых недахопаў; да хворых адносяцца ўважліва.

Ня позьняцца і ў камароўскай амбуляторыі, але доктаршы патрацілі паўгадзіны на гутаркі на тэмы хатняга маштабу: хто і дзе стаяў у чарзе, калі і што пячы да першамайскіх сьвят і г. д. Хворыя супроць гэтага не пратэстуюць. Затое, як і ўсюды, уважлівы прыём хворых—ніхто на дактароў ня скардзіцца.

У паліклініцы 1-ай больніцы з 6 дактароў без спазьненьня пачалі працаваць 2, а рэшта пазьніліся—хто на 15, хто на 20 хвілін.

Быў і такі выпадак: прыехала хворая сялянка за 40 кілёмэтраў; кажуць што спазьнілася, і яе накіравалі ў 3-ю амбуляторыю. Паехала яна туды, але ў 3-й амбуляторыі прыём распачынаецца толькі з 3 гадзіны дню. Сялянка зноў вярнулася ў паліклініку і са сьлязамі пачала прасіць, каб яе прынялі.

Але д-р Ж. досыць рэзка адказаў ёй: «Не перашкаджайце працаваць, прыходзьце ў пятніцу; я вам кажу, што сёньня ня будзеце прыняты».

Добрая рэч—за 40 кілёмэтраў «прыходзьце ў пятніцу». Але, урэшце, сялянку ўсё-ж прынялі.

Сыстэматычна позьняцца з прыходам на працу ў дзіцячым дыспансэры ня толькі дактары, а і тэхнічны пэрсанал.

Як агульнае зьявішча па ўсіх лекавых установах—адсутнасьць у пачакальні газэт, часопісаў і літаратуры. Нават там, дзе газэты і выпісваюцца, да хворых наведвальнікаў яны не даходзяць. Няма таксама ніякіх забаў і літаратуры ў дзіцячым дыспансэры.

З кнігамі скаргаў справа абстаіць зусім кепска. У Камароўскай амбуляторыі, напр., нават ключ ад кнігі скаргаў знаходзіцца ў галоўнага доктара, які бывае ў амбуляторыі 3 разы ў тыдзень.

У ЦРА па некаторых скаргах няма ніякага адказу. Есьць, напрыклад, скарга на тое, што хуткая дапамога аказваецца несваечасова, а меры ніякія ня ўжыты.

У 3-й амбуляторыі кнігі скаргаў зусім няма. Там наведвальнік, калі на што скардзіцца, піша заяву, якая перадаецца галоўнаму доктару. Да скаргі далучаецца адказ, і яна «подшивается» да справы.

Абсьледаваньне выявіла, што саюзу мэдсанпрацы неабходна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на падняцьце працоўнай дысцыпліны сярод работнікаў менскіх лекавых устаноў.

Ніякай літасьці безгаспадарнікам і прагульшчыкам.

Безгаспадарчасьць, прагулы даводзяць майстэрню да ліквідацыі

(гор. Полацак).

Пры Полацкім прамкамтрэсьце існуе сельска-гаспадарчая майстэрня, якая абсталявана па апошняму слову тэхнікі, выпрацоўвае новыя часткі машын, мае некалькі дзесяткаў рабочых і грае вялізную ролю ва ўсёй акрузе, зьяўляючыся адной дзяржаўнай майстэрняй. Для сялянства, асабліва для бядняцка-серадняцкай часткі гэта майстэрня рамантуе сельска-гаспадарчы інвэнтар і дапамагае ў вызваленьні ад прыватных майстэрняў.

Але сельска-гаспадарчая майстэрня мае некаторы дэфіцыт. За 2 месяцы мінулага году дэфіцыт быў у 1500 р. Нас цікавіць пытаньне—якія-ж прычыны гэтага дэфіцыту? Вось яны: працдысцыпліна сярод рабочых зусім адсутнічае, рабочыя прыходзяць на работу па свайму асабістаму жаданьню, кожны дзень ня прыходзіць па 2-3 рабочых; адміністрацыя безгаспадарча вядзе справу,—зусім адсутнічае нагляд, кіраўніцтва, ёсьць халатнасьць і г. д.

Аб гэтым калісьці было пастаўлена пытаньне, пасьля чаго адміністрацыя меркавала перадаць майстэрню сельсаюзу, альбо злучыцца з мясцовым працкалектывам. З прычыны гэтага складалася некалькі розных камісій, былі нарады, але канкрэтна да выніку ніхто ня пришоў—ці перадаваць майстэрню, ці злучацца з працкалектывам.

І вось, паважаная адміністрацыя прамкамтрэсту знаходзіць новы, па нашаму пагляду галавацяпскі выхад з дрэннага становішча: яна думае зачыніць сельска-гаспадарчую майстэрню і зволіць рабочых.

Майстэрню, якая мае вялізнае значэньне ва ўсёй акрузе,—зачыняць нельга. Трэба паставіць добрых адміністратараў, утварыць гаспадарчы нагляд за працай. **Ведаючыя.**

Прафэсыяналы-прагульшчыкі

(У парадку абгаварэньня).

Кожны Нарсуд у нас у Менску штодня разьбірае ад 10 да 15 спраў, па якіх выклікаюцца 25-35 чал. бакоў і каля 100 чал. сьведак, з іх каля 80 чал. рабочых і служачых. З ліку апошніх—сапраўдных сьведак, якія ведаюць справу, усяго проц. 50, астатнія справы зусім ня ведаюць, а ідуць у сьведкі толькі з мэтай, каб мець законны прагул.

Калі лічыць, што ў нас у адным толькі Менску ёсьць 5 вучасткаў Нарсуду і ў кожны з іх выклікаецца штодня каля 80 чал. сьведкаў рабочых і служачых, дык выходзіць, што ў нас штодня не працуе ў сярэднім 400 чалавек, а ў пераводзе на грошы выходзячы з разьліку 2 руб. 50 кап. у дзень—гэта складае 1000 руб. у дзень, а ў месяц—26000 руб., лічачы, што ў сярэднім у кожным судзе бывае 26 судовых пасяджэньняў у месяц. З гэтай сумы каля 10000 руб. выплачваецца так званым „ліпавым“ сьведкам.

Хто-ж дапамагае разьвівацца гэтай катэгорыі сьведкаў зрабіцца прафэсыяналамі прагульшчыкамі?—Гэтым сьведкам дапамагае разьвівацца наш Кодэкс Законаў аб Працы і ГПК, які гарантуе захаваньне заработку за выкліканымі ў суд сьведкамі па месцы іх працы (арт. 78 Код. Закон. аб Працы і 42 ГПК).

Якую-ж шкоду гэтыя сьведкі-прафэсыяналы прыносяць суду? Першае, супрацоўнікі дарма трацяць час на выпісваньне ім позваў, кур'ер дарма б'е свае ногі па ўсіх канцох гораду, каб здаць позвы, і другое—гэта тое, што суд траціць лішні час на допыты нічога ня ведаючых сьведак, чаму заўсёды канчае сваю працу позна ўвечары.

Якім-жа чынам можна з гэтым ненармальным зьявішчам змагацца?

Я лічу, што: 1) **суды павінны перайсьці на вячэрнюю працу ня менш 2-х дзён у тыдзень, наладзіўшы для ўсіх судоў аднолькавыя дні вячэрніх пасяджэньняў, прычым выхадным днём для судовых устаноў лічыць аўторак, з тым, каб па нядзелях разглядаць судовыя справы; 2) пры прыёме заяў судзьдзя ці сэкратар павінен высьвятляць, дзе працуюць вызываемыя па справе асобы, або чым займаюцца і ў залежнасьці ад гэтага назначаць разгляд справы на вечар ці дзень. 3) неабходна зьмяніць 78 арт К. З. аб Працы і 42 арт. ГПК выкласьці іх, прыкладна, у наступнай рэдакцыі: «за выкліканымі ў суд сьведкамі застаецца права на атрыманьне зарплаты па месцы працы, калі ў гэтай справе была зацікаўлена дзяржава і справа мела грамадзкае значэньне, а ў іншых выпадках аплачвае той бок, якая ставіла сьведку, якой прадастаўляецца права патрабаваць праз суд звароту выдаткаў ад прайграўшага справу боку; 4) народных судзьдзяў не нагружаць вялікай грамадзкай працай, даўшы ім магчымасьць выконваць сваю судзейскую справу па праводзеньню растлумачальнай работы на прадпрыемствах і ў клюбах аб рэвалюцыйнай законнасьці.**

Усе гэтыя мерапрыёмствы будуць лепшым сродкам у барацьбе з прагульшчыкамі,

Я не ахопліваю ўсіх фактаў, якія могуць быць па гэтым пытаньні, лічачы, што зацікаўленыя работнікі, пасьля дэтальнага яго вывучэньня, дадуць яшчэ лепшую ўстаноўку ў справе зьнішчэньня гэтых недахопаў. **НКЮ і РСІ неабходна вывучыць гэта пытаньне і даць свае ўказаньні.**

Нарсудзьдзя Менскай Яўрэйскай Нац. камэры **Сідранскі.**

Праэкт рэдакцыйна-выдавецкага пляну БДВ на 1929-30 г. і праблема стварэньня новае кнігі.

Праз пяць месяцаў Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва пачне рэалізацыю новага рэдакцыйна-выдавецкага пляну.

У мінулыя гады выдавецкі плян не падлягаў абгавору і крытыцы шырокіх колаў грамадзтва. Яно мела магчымасьць крытыкаваць ужо выкананы плян. Далей такога ненармальнага становішча не павінна быць.

Настаўніцтва, пісьменьнікі, літаратары, крытыкі, навуковыя працаўнікі, чытачы, рабочыя і сяляне павінны ведаць пра тое, што рыхтуе БДВ выпусьціць у сьвет у наступным годзе.

Будуць выдрукаваны мільёны кніг —цэлая вялізарная армія культурных адзінак. Такім чынам, рэалізацыя рэдакцыйна - выдавецкага пляну ёсьць фактычна штогодны «культурны паход». Масы павінны ведаць, што прынясе ім гэты «паход», якім культурным і ідэалёгічным багажом выступіць выдавецтва ў гэты паход. Яшчэ ёсьць час, каб азнаёміць (у асноўным) шырокія працоўныя масы з праэктам выдавецкага пляну і пачуць крытыку на гэты плян.

У частцы падручнікаў праэкт ужо абгаварваўся (папярэдня толькі) на пашыраным сходзе Навукова-Мэтадалёгічнага Камітэту НК Асьветы. Увесь праэкт і асабліва ў частцы мастацкай літаратуры быў заслуханы на сходзе ўсіх пісьменьнікаў і мастакоў гор. Менску. У бліжэйшыя часы мяркуецца паставіць праэкт выдавецкага пляну на шырокім настаўніцкім сходзе, на сходах прафактыву, партактыву і на сходах рабочых гор. Менску.

Першыя сходы, на якіх удзельнікі крытыкавалі выдавецкі плян, яскрава паказалі, што масавая крытыка дасканала дапамагае выяўленьню недахопаў праэкту. Гэты папярэдні вопыт прымушае пашырыць рамкі крытыкі, прымушае выйсьці за межы Менску, каб уцягнуць у абмеркаваньне і крытыку пляну пэрыфэрыю. Наша пэрыядычная прэса павінна дапамагчы ў гэтай адказнай справе. Зьмяшчаючы ў гэтым артыкуле асноўныя лічбы рэдакцыйна-выдавецкага пляну (паводле пяцігодкі БДВ) і адзначаючы асноўныя мэтавыя ўстаноўкі для рэалізацыі гэтага пляну, мы спадзяемся, што беларуская грамадзкасьць, і ў першую чаргу настаўніцтва, рабочы і сялянскі актыў адгукнуцца, пасылаючы свае допісы ў рэдакцыі газэт ці непасрэдна ў выдавецтва. Усе павінны быць зацікаўлены ў тым, якую кніжную прадукцыю дасьць БДВ у 1929-30 годзе.

* * *

Па праэкту прадугледжана выпусьціць з друку ад 1-X—29 г. да 1-X—30 г. 3.465 друкарскіх аркушаў або 29.332.000 адбіткаў. Увесь гэты плян падзяляецца на мовах такім чынам:

беларуская	2.930 арк.	28.523.000 адб.	
яўрэйская	325	»	1.212.500 »
польская	125	»	477.000 »
літоўская	50	»	125.000 »
латыская	25	»	50.000 »
расейская	10	»	24.000 »

Плян па кожнай мове складаецца з большага ці меншага ліку аддзелаў— падручнікі, масавая літарат., мастацкая, навукова папулярная і г. д.

Напрыклад, беларуская частка мае аддзелы:

падручнікі 1) для школ I і II канцэнтру (636 арк.), 2) для навучальных устаноў прафтэхнічнае асьветы (200 арк.), 3) для ВНУ (325 арк.), 4) для навуч. устаноў палітасьветы (85 арк.); **масавая літаратура**—400 арк. з пададдзеламі—сельска-гаспадарчая, навукова-папулярная, палітасьветная, мастацкая; **дзіцячая і юнацкая**—200 арк.; **мастацкая літаратура**—852 арк. (бэлетрыстыка—652, крытыка—100, тэатр—50, музыка—25, выяўленчае мастацтва — 25), далей ідуць аддзелы гістпартаўскіх выданьняў, вайсковых, КСМ і піянэрскай літар., «бібліятэка работніцы і сялянкі», часопісь «Полымя» і іншая літаратура (календары, кнігасьпісы, геаграф. карты, рэклямы і г. д.).

Лічбы праэкту вызначаны, як ужо сказана, паводле пяцігадовага пляну БДВ, які выпрацоўваўся з улічэньнем паказальнікаў — вопыту выдавецкай дзейнасьці за мінулыя гады (фінансавыя, гандлёвыя і паліграфічна-тэхнічныя магчымасьці апарату БДВ), пяцігадовыя пляны НК Асьветы, НК Земляробства, Н К Аховы Здароўя і інш. Лічбы паасобных аддзелаў пляну —арыентыровачныя. У працэсе рэалізацыі выдавецкага пляну яны зьмяняюцца і, звычайна, як паказвае практыка мінулых год, у бок павялічэньня.

Так, напрыклад, выдавецкі плян бягучага году быў зацьверджаны ў ліку 2185 аркушаў, а зараз дэталізаваны, рэальны плян складаецца з 3090 аркушаў. Павялічэньне адбылося па аддзелах падручнікаў, мастацк. літар. масавай і яўрэйскага пляну,

* * *

Культурная рэвалюцыя паставіла на чаргу дня праблему стварэньня зусім новай кнігі. Новай і больш дасканалай як у сэнсе тэхнічным, так асабліва ў сэнсе ідэолёгічным.

Вырашыць гэту складаную праблему можна толькі пры самым блізкім і актыўным удзеле нашых партыйных і прафэсыянальных арганізацый, пры ўдзеле і дапамозе навукова-дасьледчых інстытуцый, настаўніцтва, пісьменьнікаў, аўтараў і г. д.

Першая і асноўная задача БДВ—забясьпечыць навучальныя ўстановы падручнікамі. Але цяпер, калі навучальныя праграмы стабілізаваліся, мала забясьпечыць школы патрэбнай колькасьцю падручнікаў, трэба самую пільную ўвагу зьвярнуць на якасьць гэтых падручнікаў. Стабілізаваны падручнік мусіць быць бездакорным як з боку пэдагагічнага, так і з боку сваёй ідэалёгічнай устаноўкі. Аўтары падручнікаў павінны ўзяць цьвёрды курс на сучасны, савецкі камуністычны падручнік. Гэта-ж культурная зброя, якую мы даём маладой зьмене для барацьбы за камуністычныя ідэалы! Бальшавіцкая зброя мусіць быць чыстай ад старой буржуазнай іржы, мусіць быць новай гострай, ідэолёгічна адточанай. Трэба пачаць бязьлітаснае змаганьне з падручнікамі, аўтары якіх баяцца даць дзецям прыклады са словамі «камуніст», «камуністычная партыя“, «саветы», «калектыўныя гаспадаркі» і г. д., але затое часта-густа пхаюць словы «бог», «чорт», «дваранін», «кароль», „цар“, „пане“, «родны край», «белая армія» і інш.

Тут трэба дамагацца, каб школьны падручнік быў ня толькі «лояльным» савецкім падручнікам—гэтага зараз мала: ён павінен быць актыўным прапагандыстым савецкіх, камуністычных, інтэрнацыянальных ідэй. Кожнай сваёй старонкай, кожным словам, кожным малюнкам! Школьныя кнігі павінны быць насычаны ідэямі пралетарскай барацьбы, пралетарскага будаўніцтва.

Пачынаючы з гэтага году выдавецтва пашырыла свой плян па выданьню падручнікаў для тэхнікумаў і вышэйшых навучальных устаноў. Справа беларусізацыі сярэдняй і вышэйшай школы патрабуе ўзмоцненага тэмпу па выпуску падручнікаў для гэтых устаноў.

Праэктуецца выпуск падручнікаў для тэхнікумаў і ВНУ па цыклях: спачатку—грамадазнаўчым, пасьля прыродазнаўчым, далей—мовазнаўчым і спэцыяльным.

На працягу трох год мы павінны забясьпечыць усе тэхнікумы, а аднача сна на працягу пяці год вышэйшыя навучальныя ўстановы падручнікамі на беларускай мове.

Ужо ў гэтым годзе выдавецтва пачало выдаваць мэтадычную літаратуру, а на будучы час канкрэтна пастаўлена заданьне забясьпечыць настаўніцтва мэтадычнымі дапаможнікамі па ўсіх галінах выкладаньня. Справа гэта ўскладняецца пакуль што тым, што ў нас яшчэ не стварыўся аўтарскі кадр высокакваліфікаваных мэтадыстых.

Па лініі ліквідацыі няпісьменнасьці выдавецтва абмяжоўвалася да гэтага часу многатыражнымі выданьнямі лемантароў і чытанак вясковага тыпу. Па пляну на 29-30 год намечана выданьне падручнікаў і для гарадзкіх лікпунктаў. Але самае галоўнае, праэктам прадугледжана выданьне спэцыяльнай літаратуры для малапісьменных.

Пры сучасным становішчы малапісьменны, скончыўшы курс граматы, павінен быў пераходзіць да чытаньня бэлетрыстыкі. Ні тэхнічна (дробны шрыфт), ні па прастаце стылю (доўгія сказы, малазнаёмыя і чужаземныя словы, абстрактныя думкі і г. д.), ні ўрэшце, па цане (зборнікі цаной вышэй рубля)—гэтая бэлетрыстыка не даступна для малапісьменнага. Кадр малапісьменных складаецца з батракоў і беднякоў у вёсцы, а ў горадзе з чорнарабочых, работніц, жанок рабочых, хатніх работніц. Для іх у нас няма кніжак, ні бэлетрыстычных, ні палітычных, ні навукова-папулярных.

Гэтыя мільённыя пралетарскія пласты трэба ў першую чаргу задаволіць масавай і таннай кніжкай. БДВ у плянавым парадку будзе выпускаць невялічкія бібліятэчкі—па бэлетрыстыцы, на грамадзка-палітычныя тэмы і навукова-папулярныя кніжкі (таксама бэлетрыстычнага характару).

Справа выданьня масавай літаратуры для малапісьменных зусім новая, незнаёмая. Практыка ГІЗ'А РСФСР паказала, што даводзіцца перамагаць вялікія трудна сьці, бо ні аўтары, ні рэдактарскі апарат не маглі адразу здолець гэтай працы. Аказалася, што літаратура для малапісьменных—гэта свайго роду „процілегласьць“ звычайнай літаратуры.

«Калі звычайная палітычная, ці навуковая кніга будуецца дэдукцыйна, пабудова кнігі для малапісьменнага цалкам грунтуецца на індукцыйным мэтадзе: даецца апавяданьне пра якое небудзь зьявішча, здарэньне і толькі пад канец аўтар ад разгортваньня сюжэту пераходзіць на абстрактную мову». Малапісьменным цяжка, нудна чытаць абстрактныя рэчы, ім трэба падаць матар'ял іначай, як звычайнаму чытачу.

У кніжках для малапісьменных павінны быць спэцыяльныя пасьляслоўкі-апытальнікі, добра ўвязаныя са зьместам кніжкі, выразы—кароткія шрыфт буйны, ілюстрацыі на ўсю старонку і гэтак далей.

Ня гледзячы на цяжкасьці, навізну гэтай справы, нам трэба стварыць гэту літаратуру, даць масавую, зразумелую, цікавую і карысную кнігу.

Масавы, сапраўды масавы тыраж гэтых кніжак (15-20 тысяч) павінен гарантаваць максымальную танны цену іх.

Пра выданьне мастацкай, дзіцячай, навукова-папулярнай літаратуры—у другі раз.

Ів. Цвікевіч.

АД РЭДАКЦЫІ: Друкуючы артыкул т. Ів. Цвікевіча, рэдакцыя просіць сваіх карэспандэнтаў і чытачоў выказацца па пытаньнях праэкту рэдакцыйнага выдавецкага пляну БДВ на 1929-30 год і праблеме стварэньня новай кнігі.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова ЦВК і СНК БССР

пра зьмены ў Крымінальна-Працэсуальным Кодэксе.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць зрабіць у Крымінальна-Працэсуальным Кодэксе наступныя зьмены:

I. Арт. 26 запісаць у наступнай рэдакцыі:

«Арт. 26. Да кампэтэнцыі акруговых судоў належаць наступныя справы:

а) аб контррэвалюцыйных злачынствах;

б) аб злачынствах супроць парадку дзяржаўнага кіраўніцтва, асабліва небясьпечных для Саюзу ССР;

в) аб іншых злачынствах супроць парадку дзяржаўнага кіраўніцтва, прадугледжаных арт. 92 п. «б», 95, 103, 106 п. „в" і 117 п. «в». Крымінальнага Кодэксу;

г) аб службовых злачынствах: 1) прадугледжаных арт. арт. 196, 197, 198, 199, 203, 204 п. «б», 205 п. „б", 206, 207 п. «б», 208 п. «б», 209, 210, 211 і 212 Крымінальнага Кодэксу; 2) аб усіх іншых службовых злачынствах, прадугледжаных разьдзелам V Крымінальнага Кодэксу, калі яны ўчынены службовымі асобамі цэнтральных, акруговых і раённых дзяржаўных установаў, апроч асоб, паказаных у п.п. 2 і 3 арт. 449 гэтага Кодэксу, а таксама народнымі судзьдзямі, памоцнікамі акруговых пракурораў і натарыусамі, адказнымі службовымі асобамі дзяржаўных прадпрыемстваў, грамадзкіх і кааперацыйных установаў і прадпрыемстваў усебеларускага і акруговага значэньня;

д) аб маемасных злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 247, 252 і 262 Крымінальнага Кодэксу".

II. Дапоўніць Крымінальна-Працэсуальны Кодэкс арт. 26-а наступнага зьместу:

„Арт. 26-а. Кожная падсудная акруговаму суду справа, апроч спраў аб злачынствах контррэвалюцыйных і асабліва небясьпечных для Саюзу ССР, а таксама спраў аб злачынствах, за якія вышэйшай мерай сацыяльнай абароны вызначан растрэл, можа быць перадана на вырашэньне народнага суду: а) па пастанове акруговага суду, калі пытаньне аб перадачы ўзьнікла на судовым пасяджэньні, на якім справа ня можа быць вырашана і б) па загаду старшыні акруговага суду са згоды акруговага пракурора, калі гэтае пытаньне ўзьнікла да назначэньня справы на разгляд».

III. У выпадках, паказаных у п. 3 арт. 105 ускласьці на органы дазнаньня складаньне пастановы аб адданьні падвіноўнага пад суд, у зьвязку з чым п. 3 арт. 105, арт. арт.222, 223 і 224 зьмяніць наступным чынам:

а) у п. 3 арт. 105 словы: „для складаньня пастановы аб адданьні пад суд» замяніць словамі: „з матываванай пастановай аб адданьні падвіноўнага пад суд, для зацьверджаньня гэтай пастановы і далейшага накіраваньня справы ў суд"!

б) у арт. 222 замест слоў: „альбо пастанаўляе аб адданьні падвіноўнага пад суд", запісаць: «альбо зацьвярджае пастанову аб адданьні падвіноўнага пад суд, аб чым робіць на ёй адпаведны надпіс»;

в) арт. 223 запісаць у наступнай рэдакцыі:

«223. Справа з пастановай аб адданьні падвіноўнага пад суд (арт. 222) накіроўваецца сьледчым у суд не пазьней 3-х дзён ад дня атрыманьня справы ад органаў дазнаньня. Да пастановы аб адданьні пад суд сьледчы далучае сьпіс асоб, якія павінны быць выкліканы ў судовае пасяджэньне, а таксама сьпіс асоб, аб якіх справа вылучана альбо спынена;

г) арт. 224 запісаць у наступнай рэдакцыі:

«224. Разглядаючы справу, сьледчы павінен сачыць за тым, каб у пастанове аб адданьні пад суд былі запісаны: кароткі зьмест тых фактаў, якія складаюць злачынства, імя, імя па-бацьку і прозьвішча падвіноўнага, яго век, клясавая належнасьць, заняткі, судзімасьць, паказаньне таго, хто пакрыўджаны, месца і час злачынства, матывы і спосабы ўчыненьня злачынства, калі гэта высьветлена, а таксама якім артыкулам Крымінальнага Кодэксу прадугледжана злачынства.

Калі пастанова органаў дазнаньня аб адданьні падвіноўнага пад суд не адпавядае гэтым умовам, то сьледчы складае сваю пастанову аб адданьні пад суд".

IV. Арт. 108 запісаць у наступнай рэдакцыі:

„Арт. 108. Дасудовае сьледзтва абавязкова па ўсіх справах, падсудных акруговым судом і Найвышэйшаму Суду БССР.

Па ўсіх іншых справах дасудовае сьледзтва альбо паасобныя сьледчыя дзеяньні вядуцца паводле спэцыяльнай кожны раз пастановы сьледчага ці пастановы пракурора альбо паводле пастановы народнага судзьдзі, а калі пытаньне аб патрэбе правядзеньня дасудовага сьледзтва ўзьнікла пры разглядзе справы ў судовым пасяджэньні,—паводле пастановы народнага суду".

V. Арт. 264 запісаць у наступнай рэдакцыі:

«Арт. 264. Старшыня правярае асобу падсуднага і пытае яго, ці ўручана яму копія абвінавальнага заключэньня альбо пастанова аб адданьні пад суд.

Уручэньне падсуднаму копіі абвінавальнага заключэньня, пастановы аб адданьні пад суд альбо позвы аб яўцы ў судовае пасяджэньне з паказаньнем у ёй сутнасьцю абвінавачаньня пазьней, чымся за 3 сутак да дня судовага пасяджэньня, ня служыць перашкодаю для разгляду справы ў гэтым пасяджэньні, калі на гэта ёсьць згода падсуднага».

VI. Да арт. 313 у канцы дадаць наступныя словы: „хаця-б пры гэтай фармулёўцы справа была падсудная акруговаму суду, апроч спраў аб злачынствах контр-рэвалюцыйных і асабліва небясьпечных для Саюзу ССР, а таксама спраў, па якіх можа быць ужыта вышэйшая мера сацыяльнай абароны—расстрэл».

VII. Пункт «б» арт. 420 запісаць у наступнай рэдакцыі:

„б) зьмяніць прысуд, калі гэта можа быць зроблена без асобае праверкі довадаў і без павялічэньня меры сацыяльнай абароны, у паасобку, ужываць да асуджанага, паводле ўстаноўленых народным судом даных, арт. арт. 51 і 56 Крымінальнага Кодэксу.

VIII. Пашырыць правы пракуратуры:

а) ускласьці на пракуратуру функцыі, якія паводле арт. 148, увагі да арт. 171 і 2 ч. арт. 222 належалі суду;

б) даць пракуратуры права аддаваць пад суд па справах, па якіх вядзецца дасудовае сьледзтва, спыняць і прыпыняць гэтыя справы, а таксама аднаўляць іх пасьля спыненьня альбо прыпыненьня (арт. 133, 197--201, 203, 203-а, 204, 205, 226, 228 і 229);

в) даць пракуратуры права памяшчаць падвіноўнага ў лекавыя ўстановы (арт. 199), а таксама зьмяняць меры перасьцярогі пры накіраваньні справы ў суд (арт. 231);

г) вырашэньне скаргаў на дзеяньні пракурора ва ўсіх выпадках ускласьці на пракурора, якому ён падпарадкаван.

IX. Скасаваць распарадчыя пасяджэньні ва ўсіх судовых установах і функцыі іх ускласьці на народных судзьдзяў і старшынь акруговых судоў і Найвышэйшага Суду.

X. Даць народнаму суду права спыняць допыт сьведкаў і права недапушчаць спрэчак старон у тых самых выпадках, у якіх гэта права мае паводле арт. 394 і 397 акруговы суд.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

13 красавіка 1929 г., г. Менск.

Постановление ЦВК і СНК БССР

об изменениях в Уголовно-Процессуальном Кодексе.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют внести в „Уголовно-Процессуальный Кодекс следующие изменения:

I. Статью 26 изложить в следующей редакции:

„Ст. 26. Ведению окружных судов подлежат следующие дела:

а) о контр-революционных преступлениях;

б) о преступлениях против порядка государственного управления, опасных для Союза ССР;

в) о прочих преступлениях против порядка государственного управления, предусмотренных ст. ст. 92 п. «б», 95, 103, 106 п. «в» и 117 п. „в" Уголовного Кодекса;

г) о должностных преступлениях: 1) предусмотренных ст. ст. 196, 197, 198, 199, 203, 204 п. «б», 205 п. „б", 206, 207 п. „б", 208 п. „б", 209, 210, 211 и 212 Уголовного Кодекса; 2) о всех прочих должностных преступлениях, предусмотренных разделом V Уголовного Кодекса, „если они совершены ответственными должностными лицами центральных, окружных и районных государственных учреждений, кроме лиц, указанных в п. п. 2 и 3 ст. 449 настоящего Кодекса, а также народными судьями, помощниками окружных прокуроров и нотариусами, ответственными должностными лицами государственных предприятий, общественных и кооперативных учреждений и предприятий всебелорусского и окружного значения;

д) об имущественных преступлениях, предусмотренных ст. ст. 247, 252 и 262 Уголовного Кодекса.

II. Дополнить Уголовно-Процессуальный Кодекс ст. 26-а в следующей редакции:

«Ст. 26-а. Любое подсудное окружному суду дело, кроме дел о преступлениях контр-революционных и особо опасных для Союза ССР, а также дел о преступлениях, за которые в качестве высшей меры социальной защиты установлен расстрел, может быть передано на разрешение народного суда: а) по постановлению окружного суда, если вопрос о передаче возник в судебном заседании, в котором дело не может быть разрешено и б) по распоряжению председателя окружного суда с согласия окружного прокурора, если этот вопрос возник до назначения дела на рассмотрение.

III. В случаях, указанных в п. 3 ст. 105, возложить на органы дознания, составление постановления о предании обвиняемого суду, в связи с чем п. 3 ст. 105, ст. ст. 222, 223 и 224 изменить следующим образом:

а) в п. 3 ст. 105 слова: «для составления постановления о предании суду», заменить словами: «с мотивированным постановлением о предании обвиняемого суду, для утверждения этого постановления и дальнейшего направления дела в суд»;

б) в ст. 222. слова: „или постановляет о предании обвиняемого суду", заменить словами: «или утверждает постановление о предании обвиняемого суду, о чем делает на нем соответствующую надпись»;

в) ст. 223 изложить в следующей редакции:

«223. Дело с постановлением о предании обвиняемого суду (ст. 222) направляется следователем в суд не позже 3-х дней со дня получения дела от органов дознания. К постановлению о предании суду следователь прилагает список лиц, которые должны быть вызваны в судебное заседание, а также список лиц, о которых дело выделено или прекращено»;

г) ст. 224 изложить в след. редакции:

«224. При рассмотрении дела следователь обязан следить за тем, чтобы в постановлении о предании суду были изложены: краткое содержание фактов, образующих состав преступления, имя, отчество и фамилия обвиняемого, его возраст, классовая принадлежность, занятие, судимость, указание потерпевшего, место и время преступления, мотивы и способы совершения преступления, поскольку это выяснено, а также какой статьей Уголовного Кодекса предусмотрено преступление.

Если постановление органов дознания о предании обвиняемого суду не соответствует указанным условиям, то следователь составляет свое постановление о предании суду».

IV. Ст. 108 изложить в следующей редакции:

«108. Предварительное следствие обязательно по всем делам, подсудным окружным судам и Верховному Суду БССР.

По всем другим делам предварительное следствие или отдельные следственные действия производятся на основании специального каждый раз постановления следователя или предложения прокурора или на основании постановления народного судьи, а если вопрос о необходимости производства предварительного следствия возник при рассмотрении дела в судебном заседании,—на основании постановления народного суда».

V. Ст. 264 изложить в следующей редакции:

„Ст. 264. Председатель удостоверяется в личности подсудимого и спрашивает его, вручена ли ему копия обвинительного заключения или постановления о предании суду.

Вручение подсудимому копии обвинительного заключения, постановления о предании суду или повестки о явке в судебное заседание с указанной в ней сущностью обвинения позже, чем за трое суток до дня судебного заседания, не служит препятствием к слушанию дела в этом заседании, если на это есть согласие подсудимого".

VI. Статью 313 в конце дополнить следующими словами: «хотя бы при этой формулировке дело было подсудно окружному суду, кроме дел о преступлениях контрреволюционных и особенно опасных для Союза ССР, а также дел, по которым может быть применена высшая мера социальной защиты—расстрел».

VII. Пункт „б" ст. 420 изложить в следующей редакции:

«б) Изменить приговор, если это возможно без особой поверки доказательств и без увеличения меры социальной защиты, в частности, применить к осужденному на основании установленных народным судом данных, ст. ст. 51 и 56 Уголовного Кодекса».

VIII. Расширить права прокуратуры:

а) возложить на прокуратуру функции принадлежавшие суду по ст. 148, примечанию к ст. 171 и 2 ч. ст. 222;

б) предоставить прокуратуре право предания суду по делам, по которым производится предварительное следствие, прекращение и приостановление этих дел, а также возобновление их после прекращения или приостановления (ст. ст. 133, 197-201, 203, 203-а, 204 205, 226, 228 и 229);

в) предоставить прокуратуре право помещения обвиняемого в лечебные учреждения (ст. 199), а также изменения меры пресечения при направлении дела в суд (ст. 231);

г) разрешение жалоб на действия прокурора во всех случаях возложить на прокурора, которому он подчинен.

IX. Упразднить распределительные заседания во всех судебных учреждениях и функции их возложить на народных судей и председателей окружных судов и Верховного Суда.

X. Представить народному суду право прекращения допроса свидетелей и право недопущения прений сторон в тех случаях, в которых это право предоставлено согласно ст. ст. 394 и 397 окружному суду.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Червяков.**

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **Н. Голодед.**

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Хацкевич.**

13 апреля 1929 г.

г. Минск.

1-ы Усебеларускі зьезд лясных працаўнікоў.

Адчыненьне зьезду.

Учора ў Цэнтральным Доме Селяніна адчыніўся 1-ы ўсебеларускі зьезд лясных працаўнікоў.

Адчыняючы зьезд, намесьнік Нар. Кам. Земляробства т. **Масюкоў** у кароткай прамове спыніўся на тых задачах, якія стаяць перад зьездам.

— Урад БССР паставіў перад зьездам асноўную дырэктыву, каб узьняць на належную ступень нашу лясную гаспадарку. Мы павінны дабіцца, каб з меншымі затратамі, але з большым эканамічным эфэктам правесьці ў жыцьцё гэтыя мерапрыёмствы.

Ад ураду БССР зьезд вітаў т. Сташэўскі.

— Вы, лясныя спэцыялісты,—кажа т. Сташэўскі—працуеце на адным з адказнейшых вучасткаў нашае гаспадаркі. Лясы ў нашай рэспубліцы зьяўляюцца адной з самых галоўных крыніц дабрабыту дзяржавы і насельніцтва. Вось чаму камуністычная партыя і савецкая ўлада так многа адводзяць увагі лясной гаспадарцы. У часе імпэрыялістычнай і грамадзянскай завірухі шмат лесу ў нас было зьнішчана. Зараз перад намі стаіць задача адбудаваць лясную гаспадарку, поўнасьцю задаволіць дзяржаву і насельніцтва ў драўніне і, урэшце, здабыць больш прыбыткаў з лясной гаспадаркі.

У вырашэньні гэтых важных пытаньняў зьезд павінен сказаць сваё рашучае слова.

Ад імя саюзу с.-г. і лясных рабочых зьезд вітаў старшыня ЦП саюзу т. Вайтэнкаў.

Зьезд пастанавіў паслаць прывітальныя тэлеграмы XVI усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі, ЦВК БССР, ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ.

Асноўныя задачы лясной гаспадаркі.

(З ДАКЛАДУ Т. МАСЮКОВА).

Тав. Масюкоў у сваім дакладзе спыніўся на асноўных задачах лясной гаспадаркі ў бліжэйшае 5-цігодзьдзе.

— Урад БССР,—кажа дакладчык, імкнецца да таго, каб распачаць у бліжэйшыя гады поўную перапрацоўку драўніны ў межах БССР, вывозячы толькі фабрыкаты і поўфабрыкаты. Дзеля гэтага ў БССР арганізуецца шэраг прадпрыемстваў па перапрацоўцы драўніны: абозны завод у Гомелі, дрэваапрацовачны камбінат у Бабруйску, ф-ка штучнага валакна з дрэва ў Магілеве.

Дакладчык зварачвае ўвагу зьезду на дрэнную ахову лясоў. Ёсьць выпадкі, калі лясная варта нават ня ведае пра тое, што ў лясох дзяржаўнага значэньня робіцца распашкі. Таксама трэба ўзмацніць працу па лесааднаўленьні і палепшыць самы мэтад лесаэксплёатацыі, а ў гэтай галіне у нас ня ўсё абстаіць добра. Адначасова перад зямельнымі органамі БССР стаіць задача аб залясеньні ўсіх зямель не палявога значэньня, і больш рашуча паставіць пытаньне аховы лясоў мясцовага значэньня.

— Мы ставім задачу,—кажа т. Масюкоў,—атрымліваць ад лесу больш прыбыткаў і палепшыць якасьць вучоту лясной драўніны. Нам трэба ўзяцца за разьвіцьцё леса-хэмічнай прамысловасьці.

У бліжэйшае 5-цігодзьдзе мяркуецца лесааднавіць 75 проц. агаленых лясных плошчаў і асушыць да 140000 гэкт. забалочаных лясоў. Лесаўпарадкаваньне мяркуецца закончыць у бліжэйшыя 2 гады.

Дакладчык зварочвае ўвагу на тое, што ў нас няма спэцыялістаў па ўсіх галінах лясной гаспадаркі. Часта прыходзіцца працаваць з даўнейшымі лесапрамыслоўцамі. Апрача падрыхтоўкі новых кадраў спэцыялістаў, трэба занясца перакваліфікацыяй старога складу.

ХРОНІКА.

Да арганізацыі буйнага керамічнага камбінату.

Горная група ВСНГБ летась правяла горныя разьведкі найбольш каштоўнага ў БССР раёну мінэральнай сыравіны для керамічнай вытворчасьці ў Лоеве, Гомельскай акругі. Падрабязна дасьледаваны залежы самых разнастайных глін і фарбаў Ляхавай гары. Апрача таго, праведзена папярэдняе дасьледаваньне раёну Лоева і Шчацецкая гара на беразе Дняпра.

У дасьледаванай мясцовасьці высьветлены вялікія запасы глін—чарапічных, для клінкёру, каналізацыйных труб і іншых вырабаў.

Узоры гліны Ляхавай гары былі дасьледаваны Дзяржаўным Інстытутам сілікатаў у Маскве, прычым, яна прызнана зусім прыгоднай для паказаных мэт.

Трэба адзначыць, што ў прыродзе вельмі рэдка сустракаюцца такія разнастайныя камбінацыі глін і фарбаў, якія назіраюцца ў Лоеўскім раёне. Запасы сыравіны на Лоевай гары могуць забясьпечыць працу буйнага керамічнага камбінату на тэрмін звыш 40 гадоў.

Прэзыдыум ВСНГБ, абгаварыўшы гэта пытаньне, даручыў спэцыяльнай камісіі прапрацаваць матар'ялы аб пабудове ў бягучым годзе ў Лоеўскім раёне шэрагу керамічных прадпрыемстваў.

Сустрэча гаспадарнікаў з рабкорамі.

Дзеля выяўленьня недахопаў у працы прамысловасьці і сумеснага абгаварэньня мерапрыёмстваў для яе палепшаньня прэзыдыум ВСНГ Бел. пастанавіў у бліжэйшым часе наладзіць сустрэчу менскіх гаспадарнікаў з рабкорамі газэт.

Т-ва па барацьбе з алкагалізмам у першамайскія дні

Ячэйкі таварыства па барацьбе з алкагалізмам прымуць самы актыўны ўдзел у Першамайскай і антырэлігійнай кампаніі. Зараз па ячэйках ідзе распрацоўка мерапрыёмстваў, якія павінны дапамагчы адцягнуць і заняць рабочых у часе «вялікадня». Будуць наладжвацца вечары з чаем, танцамі і іншымі забавамі.

У Першамайскай дэманстрацыі ячэйкі пойдуць у саюзных калёнах, але з сваімі лёзунгамі.

Усебеларуская канфэрэнцыя школ сялянскай моладзі.

Нар. Кам. Асьветы БССР на 10 чэрвеня склікае Ўсебеларускую канфэрэнцыю працаўнікоў школ сялянскай моладзі. На гэту канфэрэнцыю запрошаны прадстаўнікі НКА РСФСР і УССР.

26000 руб. на пабудову клюбу.

Прэзыдыум ВСНГБ, пры зацьверджаньні пляну фінансаваньня Віцебскай акулярнай фабрыкі на бягучы год, вызначыў 26000 р. на пабудову пры фабрыцы рабочага клюбу.

Папаўненьне БДМ новымі карцінамі.

БДМ у хуткім часе атрымлівае з Эрмітажу (Масква) 26 карцін замежных мастакоў 18-га і пачатку 19-га ст.ст. Частка карцін зьяўляюцца арыгіналамі.

Курсы для перападрыхтоўкі настаўніцтва.

Сёлета Наркамасьветы адчыняе шэраг кароткатэрміновых курсаў для перападрыхтоўкі настаўніцтва.

Так, у Менску будуць працаваць курсы для перападрыхтоўкі настаўнікаў яўрэйскіх і польскіх школ, кіраўнікоў дзіцячых дамоў і курсы піянэр-працаўнікоў.

Апрача таго, у Менску адбудуцца курсы-канфэрэнцыі настаўнікаў школ сялянскай моладзі, фабрычна-заводзкіх сямёхгодак і настаўнікаў літаратуры 2-га канцэнтру.

Разам з тым у Магілеве будуць адчынены месячныя курсы працаўнікоў хат-чытален, у Горках—настаўнікаў прыродазнаўства.

Частка курсаў пачне працу з 15 мая, а рэшта—з 15 чэрвеня. На ўтрыманьне курсаў адпушчана 19896 руб.

За арганізацыю працоўных дружын!

Па пляну ЦК камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, пры кожным сельсавеце мае быць сёлета арганізавана працоўная дружына. У склад дружыны павінны ўваходзіць сельсавецкі, камсамольскі і камітэцкі актыў; у іх распараджэньне перадаецца ўвесь інвэнтар і с.-г. прылады, якія ёсьць у даным к-це ўзаемадапамогі. Такія дружыны павінны обслугоўваць у часе сяўбы і ўборкі маламоцныя гаспадаркі ўдоў, сем'яў чырвонаармейцаў, інвалідаў вайны.

Па тых вестках, якія да гэтага часу атрыманы ў ЦК КСУ, можна меркаваць, што кампанія арганізацыі дружын разьвярнулася слаба. Да гэтага часу арганізавана ўсяго 298 дружын, гэта амаль напярэдадні сяўбы.

Сёлета, калі пытаньню ўзьняцьця ўраджайнасьці надаецца асаблівае значэньне, калі мабілізуюцца на гэту справу ўсе сілы і сродкі—нельга абыйсьці моўчкі такое важнае пытаньне, як арганізацыя грамадзкай дапамогі гужавой і працоўнай сілай беднаце ў часе вясеньняй сяўбы.

Ня трэба гаварыць аб тым, якое будзе мець гаспадарчае значэньне сваечасовае правядзеньне сяўбы, але гэтым самым мы вырываем з-пад уплыву кулацтва дзесяткі тысяч беднякоў. Пакуль ня позна, справу арганізацыі працоўных дружын трэба ўзмацніць. На мясцох трэба больш рашуча, больш актыўна ўзяцца за гэту справу.

Ніводнага камсамольца, ніводнага партыйца, ніводнага актывіста не павінна быць па-за шэрагамі дружын!

На барацьбу з алкагалізмам.

Гэтымі днямі адбыўся пашыраны пленум Менскага акруговага камітэту па барацьбе з алкагалізмам. У працы пленуму прынялі ўдзел прадстаўнікі нізавых ячэек таварыства.

Цэнтральным пытаньнем, якое абгаварыў пленум, быў праэкт пастановы Савнаркому аб мерапрыёмствах па барацьбе з алкагалізмам, які таварыства ўносіць на зацьверджаньне ўраду.

У праэкце прадугледжваецца шэраг мерапрыёмстваў для абмежаваньня продажу саракаградуснай і розных водачных вырабаў. Згодна праэкту, гарсаветам і паогул саветам рабочых раёнаў даецца права зачыняць усялякія месцы продажу сьпірытусавых напіткаў па хадайніцтву рабочых арганізацый, або на падставе пастаноў агульных ці дэлегацкіх сходаў рабочых. Пастановы гарсаветаў аб зачыненьні месц продажу водкі павінны будуць неадкладна праводзіцца ў жыцьцё.

Прадугледжвае таксама праэкт пастановы забарону ў гарадох і рабочых раёнах гандаль водкай і іншымі сьпірытусавымі напіткамі ва ўсе сьвяточныя і перадсьвяточныя дні, а таксама ў дні адпачынку і напярэдадні апошніх. У раёнах фактычна заводзкіх прадпрыёмстваў продаж водкі павінен спыняцца і ў дні выдачы заработнай платы.

Павінен таксама быць забаронен продаж і расьпіцьцё водачных вырабаў у мясцох грамадзкага карыстаньня, як сталоўкі, буфэты ў клюбах і г. д.

Дзяржплян пры складаньні 5-х гадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі павінен усебакова ўлічыць задачы барацьбы з алкагалізмам як у адносінах скарачэньня вытворчасьці алкаголю і продажу яго, так і шляхам узмацненьня культурна-асьветных мерапрыёмстваў па барацьбе з алкагалізмам.

Нар. Кам. Аховы Здароўя трэба распрацаваць мерапрыёмствы па лячэньню алкаголікаў, а разам з тым неабходна падумаць аб пашырэньні сеткі супроцьалкагольных дыспансэраў.

Дзеля барацьбы з алкагалізмам неабходна арганізаваць і пашырыць вытворчасьць фруктовых і ягадных вод, хлебнага квасу і іншых безалкагольных напіткаў.

Грамадзкае харчаваньне павінна мець важнае значэньне ў галіне барацьбы з алкагалізмам. У праэкце прадугледжваюцца захады да пашырэньня сеткі чайных і рабочых кафэ з мастацкімі і культурнымі забавамі.

Наркамасьветы трэба ў праграмах усіх навучальных установаў адвесьці месца для вывучэньня пытаньняў барацьбы з алкагалізмам, а таксама прыняць меры да пашырэньня сеткі бібліятэк і чытальняў. Белдзяржвыдавецтву даюцца дырэктывы зьнізіць цэны на кнігі, якія разьлічаны на масавага чытача.

Побач з гэтым, Наркамасьветы сумесна з зацікаўленымі грамадзкімі арганізацыямі неабходна ўзмацніць мерапрыёмствы па набліжэньні тэатраў і музыкі да рабочых раёнаў і зьніжэньні кошту тэатральных білетаў. Павінна быць пашырана і радыёфікацыя.

Нар. Кам. Юстыцыі і Нар. Кам. Унутраных Спраў неабходна ўзмацніць мерапрыёмствы па барацьбе з шынкарствам.

СУД.

БУЙНАЯ ПАКРАЖА АБЛІГАЦЫЯЎ З КАСЫ РВК.

Ноччу на 8 сьнежня 1928 году, шляхам падбору ключа да незгараемай грашовай скрынкі Лагойскага РВК, была зроблена пакража налічнымі грашыма 213 р. 26 к. і каштоўнымі паперамі—аблігацыямі пазыкі індустрыялізацыі—на суму 14.325 руб. Дзьверы ў памяшканьні РВК аказаліся цэлымі, а разбіты два аквы ў пакоі, дзе памяшчалася грашовая частка РВК. У крадзяжы быў западозраны сторож РВК Рыгор Рыгораў Сенюковіч, які раней служыў рабочым у савхозе «Лагазна» і меў цесную сувязь з сваімі шваграмі Язэпам і Францам Арасоўскімі. Папярэднім дазнаньнем было ўстаноўлена, што Красоўскія — спэцы па падборы розных ключоў як сьлесары, што два гады таму назад Сенюковіч, Казлоўскія і Язэп Вальшукі былі судзімы за кражу.

На папярэднім сьледзтве Рыгор Сенюковіч у злачынстве прызнаўся і паказаў, што крадзеж зрабілі Красоўскія, і што аблігацыі і грошы яны захавалі ў зямлі пад дубам недалёка ад савхозаў „Лагазна". Калі Сенюковіча павезьлі на самакаце паказаць месца, дзе захаваны аблігацыі, ён па дарозе раздумаў і ад паказаньняў сваіх катэгарычна адмовіўся.

Праз тыдзень Франц Красоўскі наняў грамадз. Язэпа Вальвіцкага і ноччу хацеў прывезьці аблігацыі ў Менск для рэалізацыі, але калі Красоўскага і Вальвіцкага затрымаў ноччу і з падводай і куферкам сторож савхозу Батановіч, Франц Красоўскі схапіў з воза куфэрак з аблігацыямі і схаваў іх.

Паказаньнямі сьведак устаноўлена, што Сенюковіч зрабіў пакражу з швагрымі Красоўскімі, а Вальвіцкі дапамагаў ім захаваць аблігацыі.

Справа разглядалася ў Менскім акруговым судзе, які прыгаварыў: Рыгора Сенюковіча на пяць гадоў зьняволеньня, Язэпа і Франца Красоўскіх—на 4 гады зьняволеньня кожнага і Язэпа Вальвіцкага—на тры гады зьняволеньня скараціўшы апошняму меру сацыяльнай абароны напалову па амністыі.

Д. К.

ВОДГУКІ НА КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

КАРЗУН БУДЗЕ ВЫКЛЮЧАН З УНІВЭРСЫТЭТУ.

У допісе «Як кулак пралез у шчэль», пасланым на расьследаваньне, паведамлялася, што на пэдфаку БДУ вучыцца сын кулака Глускага раёну, Бабруйскай акругі, Карзун, які атрымлівае дзяржаўную стыпэндыю. Расьследаваньнем факты пацьвердзіліся. Узьнята пытаньне перад праўленьнем БДУ аб выключэньні Карзуна са складу студэнтаў.

ЗЯМЛЯ Ў КСЯНДЗА ЗАБРАНА.

У допісе „Пашыліся ў дурні", зьмешчаным у № 297 за 26-XII—28 г., паведамлялася, што па Іску Росіцкага сельсавету, Дрысенская райзямкамісія прыняла пастанову адабраць у ксяндза Капусты 5 дзесяцін зямлі, таму што сам ён не апрацоўвае, але чамусьці Полацкі Акрзя вярнуў ксяндзу зямлю.

З пратаколаў пасяджэньня Полацкай АЗК ад 18-XII—28 г. відаць, што пастанова Дрысенскай РЗК АЗК прызнана правільнай і зацьверджана, а вучастак Капусты залічан у дзяржаўны фонд.

РЖЭЦКІ ВЫКЛЮЧАН.

У допісе «Трэба паклапаціцца, пакуль ня позна», пасланым на расьследаваньне, паведамлялася, што ў Барысаўскім пэдтэхнікуме вучыцца сын кулака—Ржэцкі Вільгэльм. Факт расьследаваньнем пацьвердзіўся. Ржэцкі выключан з тэхнікуму.

ПРАЦА АЗДАРОЎЛЕНА.

У допісе «Няма газэт, а ёсьць п'янка», зьмешчаным у № 2 за 2-І—29 г., паведамлялася, што ў калгасе «Трактар» Цялевіцкага сельсавету, Бабруйскай акругі, разам з дасягненьнем ёсьць хворыя зьявішчы—п'янства і інш. У калектыве адсутнічае культурная праца і газэта.

На допіс Бабруйскі акрсельсаюз паведамляе, што прыняты адпаведныя меры, і зараз у калектыве ўзьнята культпраца, зьнішчана п'янка і ўлажан канфлікт паміж сябрамі калектыву.

ГАНДЛЕМ ЗАЙМАЛАСЯ ФРЭНКЕЛЬ, А НЯ ЧОПІК.

У допісе „Чопік ліквідуе", зьмешчаным у № 70 за 20-III г. г. паведамлялася, што настаўнік Вязавіцкага лікпункту, Калінавіцкага раёну, працуючы ў школе, адначасова займаецца гандлем мануфактурай і вучэбнымі прыладамі.

З атрыманых матар'ялаў відаць, што гэта мела месца, але на Пяратоцкім лікпункце, дзе настаўнікам зьяўляецца Фрэнкель Л., у адносінах да якога прыняты адпаведныя меры.

Праграма перадач

Беларускага Радыёцэнтру праз Менскую радыё-тэлефонную станцыю імя СНК БССР на хвалі 949,6 мэтраў і праз Гомельскую радыёстанцыю імя т. Сталіна на хвалі 467 мэтраў.

Пятніца, 26-га красавіка.

17—30—Час акцябрат.
17—55—Інфармацыя СНКБ.
18—10—Музычны адпачынак.
18—55—Лекцыя рабоча-сялянскага радыё-універсытэту (падрыхтоўчага курсу).
1. На беларускай мове—25 хв.
2. „ „ літаратуры—25 „
19—25—Беларуская радыёгазэта.
20—10—Даклад.
21—00—Канцэрт.
23—00—Агляд заўтрашняй прэсы.
23—18—Вурок азбукі «Морзэ».

Субота, 27-га красавіка.

17—40—Гутарка з сялянамі з цыклю „За ўраджай".
18—25—Перадача для работніцы, сялянкі і хатняй гаспадыні.
18—50—Музычны адпачынак.
19—25—Беларуская радыё-газэта.
20—10—Час бязбожніка на яўрэйскай мове—15 хв.
Музычная ілюстрацыя на яўрэйскай мове—15 хв.
Замена п'яных сьвят — сьвятамі рэвалюцыйнымі—15 хв.
23—00—Агляд заўтрашняй прэсы.
23—15—Вандраваньне па эфіру.

Надзеля, 28-га красавіка.

10—00—Сялянская радыёгазэта з антырэлігійнай старонкай.
11—15—Сялянскі канцэрт.
12—20—Сьпявайце разам з намі.
12—50—Палітычны даклад.
17—00—Час піанэра і школьніка.
18—00—Камсамольская радыёгазэта.
18—30—Лекцыя рабоча-сялянскага радыё-універсытэту.
19—20—Канцэрт народнай музыкі.
20—00—Літаратурна-музычны журнал.
21—00—Канцэрт.

Панядзелак, 29-га красавіка.

17—40—Пасьляабедзенны канцэрт.
18—10—Даклад «Індустрыялізацыя краіны і паднясьце вытворчасьці і працоўнай дысцыпліны».
18—40—Лекцыя рабоча-сялянскага радыё-універсытэту.
19—25— Беларуская радыёгазэта.
20—10—Выступленьне старшыні ЦП саюзу чыгуначнікаў.
20—35—Даклад на польскай мове аб «Першым Маі».
21—00—Канцэрт і трансьляцыя.
23—00—Агляд заўтрашняй прэсы.

Аўторак, 30-га красавіка.

17—40—Гутарка з сялянамі
18—05—Музычны адпачынак.
18—50—Радыёаматар па радыё з адказамі на тэхнічныя пытаньні.
19—30—Беларуская радыёгазэта.
20—15—Даклад «ПершаеМая і Камінтэрн»
20—40—Перадача на мове эсперанто.
21—05—Канцэрт, у перапынках выступленьне паліт. катаржан з успамінамі.
23—20—Агляд заўтрашняй прэсы.
23—40—Вурок азбукі «Морзэ».

Серада, 1-га мая.

8—30—Радыё календар з Масквы.
9—00—Час рэвалюцыйных маршаў— аркестр.
10—00—Трансьляцыя параду войск.
10—00—Усесаюзная пераклічка Чырвоных Плянаў.
14—00—Трансьляцыя канцэрту рэвалюцыйнай музыкі—Масква.
16—00—Трансьляцыя першамайскіх радыёчасоў моладзі.
18—00—Аб'яднаны нумар радыёгазэт.
20—00—Трансьляцыя інтэрнацыянальнага вечару з Масквы.

Чацьвер, 2-га мая.

10—00—Інтэрнацыянальны дзіцячы ранішнік
11—00—Сялянскі сьвяточны канцэрт.
12—30—Даклад.
13—00—Трансьляцыя Масквы.
17—00—Сьвяточны нумар радыёгазэты для сельгасрабочых «Беларускі Батрак".
18—00—Даклад „Культурная рэвалюцыя і рэлігія».
18—30—Перадача для работніц, сялянак і хатніх гаспадынь.
19—00—Вялікі інтэрнацыянальны сьвяточны вечар і трансьляцыя з Масквы.

Пятніца, 3-га мая.

17—30—Час акцябрат.
17—55—Даклад.
18—15—Музычны адпачынак.
18—35—Лекцыя рабоча-сялянскага Радыё-Універсытэту (падрыхтоўчага курсу).
19—25—Антырэлігійны вечар.
20—30—Канцэрт.
23- -00—Духавы аркестр.
24—00—Праверка часу. Трансьляцыя Крамлёўскай Башні.

Субота, 4-га мая.

18—00—Даклад «Патрэбен-лі бог у сельскай гаспадарцы».
18—25—Перадача для работніц, сялянак і хатн. гаспадынь «Рэлігія і быт».
18—50—Анты-рэлігійны вечар.
19—40—Даклад: «Навука і рэлігія».
20—10—Працяг вечару.

Надзеля, 5-га мая.

10—00—Антырэлігійны нумар сялянскай радыёгазэты.
11—00—Сялянскі канцэрт.
12—00—Канцэрт духавога аркестру.
17—00—Час піанэра і школьніка.
18—00—Даклад: «Значэньне друку ў сацыялістычным будаўніцтве».
18—30—Беларуская радыёгазэта, прысьвечаная дню Друку з выступленьнямі рэдактароў друкарных газэт.
19—00—Літаратурна-музычная часопісь.
21—00—Трансьляцыя.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кнігі і часопісі.

1. „Мый да дзірак" К. Чукоўскі. Кінематограф для дзяцей. Малюнкі Ю. Аненкава. Стар. 24, цана 40 кап.

2. «Канюшына» Д. Пракапенка. Выданьне другое, выпраўленае. Стар. 56, цана 15 кап. Выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

3. „Наш край" № 3. Штомесячнік Цэнтральнага Бюро Краязнаўства пры Беларускай Акадэміі Навук. Стар. 74, цана 50 кап.

4. «Плуг» № 2. Літаратурна-мастацкі месячнік. Стар. 79, цана 50 кап. Кааперацыйнага Выданьня Т-ва Пісьменьнікаў „Плужанин" Харкаў.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 26-4-29 г.

	Куп.	Прад.
1-я 6 проц. залатая выйгрышная пазыка	44-88,5	—
2-я 6 проц. залатая выйгрышная пазыка	5—00 —	—
Бясроц. пазыка 26 г.	123—75	—125—75
10-проц. Дзярж. выйгрышная пазыка 27 г.	25—49	—25—59
6-я проц. дзяр. пазыка індустр.	25—32,5	—25 -42,5
3-я сялянская 1927 г.	5—02	— —
12 проц. рэнтн. 1927 г.	104—83	— —
2-я 6 проц. пазыка проц. вып.	26—50,5	26—60,5
Пазыка індустрыял. бяспроц. вып.	26—11	—26—21
11 проц. Дзярж. Унутр. пазыка 1928 г.	101—67	—101—72

Паштовая скрынка.

«Месткому». Ваш артыкул «Сатрапинчество, садизм, или шовинизм» пераслалі ў Менскі акр. інспэктарыят нар. асьветы.

Капчыцу. Менск. Ваш ліст пераслалі ў ЦП Саюзу прапасьветы.

З. НОВІК. Юравічы. Пераслалі ў Мазырскі акр. інспэктарыят Нар. Асьветы.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, а 8 гадз. увеч.—лекцыя «Паходжаньне вялікадня». Пасьля кіно.

— У нядзелю, 28-IУ, сымфанічны канцэрт (2-я сымфонія Бэтховэна, арыі з опэр і інш.). Білеты для сяброў Дому—25 кап.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА**

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

ПЯТНІЦА, 26 КРАСАВІКА

Саюзу Мэдсанпрацы

„М О С Т"

Пачатак а 8-й гадзіне ўвечары.

Астача білетаў у касе тэатру ад 6-й гадзіны.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». — З аўторка, 23 красавіка. МАСТАЦКІ БАЯВІК **„ДЖЫМІ ХІГІНС"** ПА РАМАНУ Э. СІНКЛЕРА.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». — МАСТАЦКІ БАЯВІК **„МОТЭЛЭ ШПІНДЛЕР"** ДРАМА Ў 6 ЧАСТКАХ.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ — З АЎТОРКА 23 КРАСАВІКА **„ГЕРОІ КАНЦАВОСЬСЯ"** ПАЧАТАК СЭАНСАЎ А 6 З ПАЛ. ГАДЗ.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». — **„Стэнлей у нетрах Афрыкі".** 2-я сэрыя.

ПАТРАБУЮЦЦА АГРАНОМЫ

У ВІЦАКРКАЛГАССАЮЗЕ МАЮЦЦА ВАКАНТНЫЯ МЕСЦЫ:

РАЗ'ЯЗДНОГА ІНСТРУКТАРА ПА КАЛГАСАХ, ІНСТРУКТАРА ПА МАШЫННЫХ Т-ВАХ З АКЛАДАМ ПЭНСІІ 135 р. У МЕС. І ПЯЦІ КУСТАВЫХ АГРАНОМАЎ З АКЛАДАМ 100 р. У МЕС. ПРЫ ГАТОВАЙ КВАТЭРЫ.

З прапановамі зварочвацца: Віцебск, Рынчая в., № 9, Віцакркалгассаюз.

ЗГУБЛЕНЫ:

Конская кніжка Карнюшка І., выд. Бытчанскім РВК у 1918 г., кв. 135-п.

Дапризыўная кніжка № 32 Цьвінадонскага К. К., выд. Гарэцкім РВК, кв. 137 п.

Сяброўская кніжка № 616028 Пятрова І.Ц., выд. саюзам будаўнікоў, кв. 137-п.

Страхавая кніжка № 1124 Пятрова І. Ц., выд. Гарэцкім страхпунктам, кв. 137-п.

Заліковая кніжка № 163 Жыляева М. А., выд. Белар. с.-гасп. акадэм., кв. 137-п.

Конская карт. за № 1275 Хахлова П., выд. Гарэцкім РВК, кв. 137-п.

Сяброўскі білет № 78099 Вашчэвова Ф.А., выд. Гарэцкім акружк. ЛКСМ, кв. 137-п.

Асабовае пасьведчаньне за № 829 Кіршанкова Ц. Е., выд. Белар. с.-гасп. акадэм., кв. 137-п.

Дапризыўная кніжка № 135 Жукава І. А., выд. Гарэцкім РВК, кв. 137-п.

Сяброўская кніжка за № 6.46 Шумахэра С. Г., выд. Менск. саюзам будаўнікоў, кв. 656.

Сяброўскі білет № 23304 Пісарэнка П. І., выд. саюзам сельгасрабоч., кв. 657.

Пасьведчаньне № 526 Пісарэнка П. І., выд. Менскім Акрва, кв. 658.

Згублен. чырвонаарм. кніжка, выд. 2-м эскадр. 38-га кав. палка на імя Кашко І.К.—знайшлася, лічыць маючы моц, кв. 659.

Конская карт. за № 1085 Лёўкаўца Б. Ф., выд. Тураўскім РВК. кв. 131-п.

Пасьведчаньне за № 226 Буката М. Я. аб нягоднасьці да вайсковай службы, выд. Мазырск. АВК, кв. 132-п.

Пасьведчаньне за № 94 аб нягоднасьці да вайсковай службы, выд. Мазырскім акрваенкаматам; 2) паявая кніжка, выд. Меляшкоўскім спаж. т-вам на імя Баруна А. Д., кв. 158-п.

Асабовая карт. за № 21-15 Гінзбурга С. В., выд. Мазырскім акрваенкаматам, кв. 159-п.

Сяброўскі білет Гольдэнбэрга Б. І., выд. II маскоўск. універсытэтам, кв. 160-п.

Паявая кніжка, выд. Мсьціслаўскім спаж. т-вам; 2) 2 конск. карт., выд. Мсьціслаўскім РВК; 3) асабова-вайсковая кніжка выд. Мсьціслаўскім РВК, 4) паяўніцкі білет, выд. Мсьціслаўскім сельсаў паяўніцкім на імя Хадкевіча І., кв. 161-п.

Галоўлітбел 595.

Менск, дзяржаўная друкарня.